Кірмаш на „Міколу” ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Падарожжа з гісторыяй ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 23 (2873) Год LVI | Беласток, 5 чэрвеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

ФЕСТЫВАЛЬ ФЕСТЫВАЛЯЎ ЗАВЕРШАНЫ

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

У перадапошні дзень мая завяршыўся трыццаты, юбілейны Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі (фестываль спяваючай душы). У дзень інаўгурацыі, у яго кулуарах сусветнай славутасці дырыжор і кампазітар, а заадно мастацкі патрон Кшыштаф Пэндэрэцкі заявіў журналістам: „Гэта найбольшы фестываль царкоўнай музыкі, і не толькі ў Польшчы”. Пераможцам сёлетняга выпуску стаў Камерны хор Дзяржаўнай філармоніі з горада Астана, сталіцы Казахстана (катэгорыя прафесійных хароў). Сярод чатырох беларускіх хароў аж тры сталі лаўрэатамі ўзнагарод.

Пераможцам сёлетняга выпуску стаў Камерны хор Дзяржаўнай філармоніі з Астаны ў Казахстане (катэгорыя прафесійных хароў)

— Можа ўрэшце Казахстан не будзе асацыявацца толькі з коньмі і ездакамі, але і з цудоўнай царкоўнай музыкай, — сказаў пасля абвяшчэння вынікаў дырыжор казахскага хору Ержан Даутаў.

У конкурсных слуханнях у актавай зале палаца Браніцкіх выступілі хары парафіяльныя, аматарскія свецкія, прафесійныя і музычных вучэльняў, прафесійныя і дзіцяча-маладзёжныя. Агулам прэзентавалася 28 хароў (два не даехалі) з каля дваццаці краін. Большасць з іх гэта лаўрэаты папярэдніх выпускаў конкурсу, некаторыя неаднаразовыя. З ліку чатырох хароў з Беларусі лаўрэатамі сталі: жаночы хор „Элегія” (катэгорыя: аматарскія свецкія хары; другое месца), дзіцячы хор „Ліра” (катэгорыя: хары дзіцяча-маладзёжныя; першае месца і ўзнагарода старшыні Польскага тэлебачання) ды Акадэмічны хор Дзяржаўнага радыё і тэлебачання (катэгорыя: прафесійныя хары; пароўну другое месца). Усе з Мінска. Неўзнагароджаны быў толькі хор „Дзянніца” з Гомеля (катэгорыя: аматарскія свецкія хары). Дырыжорка найвышэй ацэненага беларускага ансамбля — хору „Ліра” Алена Лацапнева адказала „Ніве” на пытанне, як заахвоціць дзяцей і моладзь да царкоўнай музыкі:

— У царкоўнай музыцы закладзеныя агромны духоўны патэнцыял і агромны духоўны сэнс. І калі дзецям данесці гэта ясна, то яны ў сабе гэта адкрываюць і ажыццяўляюць кожнае з божых слоў.

Фестываль пачаўся 24 мая. Хор Медычнага ўніверсітэта ў Беластоку пад кіраўніцтвам Бажэнны Савіцкай выканаў „Gaude Mater Polonia”. У сваю чаргу Дзяржаўны расійскі хор імя А. Свешнікава з Масквы пад кіраўніцтвам праф. Барыса Тэўліна — сціхіру „Русская земля”. Гэты расійскі хор выступіў таксама з горача прынятым інаўгурацыйным канцэртам, а яго дырыжор пасля ў рамках аднае са спадарожных падзей вёў майстар-клас са студэнтамі Музычнага ўніверсітэта. Гэтыя самыя творы выкананы былі на гала-канцэрце, але ў іншым складзе. Дырэктар фестывалю Мікола Бушко ў час інаўгурацыі ўспомніў мінулыя трыццаць гадоў:

— Гэта тут, на Падляшшы, царкоўная музыка з’яднала прадстаўнікоў шматлікіх народаў, рэлігій і культур. Аказалася, што мастацкасцю і духоўнасцю царкоўнай музыкі зацікаўлены амаль увесь свет.

Дзіцячы хор „Ліра” з Мінска (катэгорыя: хары дзіцяча-маладзёжныя; першае месца і ўзнагарода старшыні Польскага тэлебачання)

Юбілейны выпуск фестывалю ў зале Падляшскай оперы і філармоніі адкрылі супольна (даслоўна; інаўгурацыйны сказ вымавілі ў адзін голас) падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі і прэзідэнт Беластока Тадэвуш Трускаляскі. Раней маршалак звярнуўся да слухачоў і выканаўцаў:

— Тыя, што ствараюць гэты фестываль — яго добрыя духі, носяць культуру ў сэрцы. А чаму Царква спявае? Бо самага Божага слова недастаткова.

Прэзідэнт Беластока:

— Кажуць, што добрыя людзі спяваюць. Лік добрых людзей, якія прайшлі праз сцэны гэтага фестывалю царкоўнай музыкі — вельмі вялікі. Ды што з тымі, што спяваць не ўмеюць? Калі не ўмеюць спяваць, ды любяць слухаць — яны таксама добрыя людзі.

У сваю чаргу рэктар Універсітэта ў Беластоку праф. Ежы Нікітаровіч сказаў:

— Тое, што адбывалася на працягу гэтых трыццаці гадоў, будавала дыялог паміж культурамі, рэлігіямі, а перш за ўсё паміж веравызнаннямі, паміж веравызнаннямі ўсяе хрысціянскае рэлігіі.

Журы з шасці асоб ачоліў, як звычайна, кампазітар (таксама царкоўнай музыкі, выконванай у час фестывалю) прафесар варшаўскага Музычнага ўніверсітэта імя Ф. Шапэна Рамуальд Твардоўскі. У размове з „Нівай” ужо пасля схуканняў дзяліўся ўражаннямі:

— Адным са здабыткаў гэтага фестывалю з’яўляецца азнаямленне шырэйшага кола асоб са здабыткамі, традыцыямі і музычнай культурай Усходняй царквы. Як сказаў Ян Павел II, „Еўропа павінна дыхаць абодвума лёгкімі”. Мы за тыя трыццаць гадоў прабавалі асвоіць слухача з тым, што з’яўляецца прыгожым у музыцы такога маштабу.

У гала-канцэрце ўдзельнічаў асабіста м.інш. каталіцкі беластоцкі мітрапаліт арцыбіскуп Эдвард Азароўскі (не было афіцыйна нікога з прадстаўнікоў Царквы; гэтак было ў час усяго фестывалю, хоць прыкмецілі мы праваслаўных святароў па-цывільнаму). Побач лаўрэатаў выступіў, адзначаючы 40-годдзе дзейнасці, Ансамбль царкоўнай музыкі пад кіраўніцтвам а. Юрыя Шурбака (Варшава), ад пачатку звязанага з фестывалем. Ягоны хор у 1982 г. аздабляў гала-канцэрт першага выпуску. Фестываль адбываўся пад патранатам прэзідэнта Браніслава Камароўскага ды міністра культуры і нацыянальнай спадчыны, маршалка Падляшскага ваяводства і прэзідэнта Беластока. Медыйны патранат трымала таксама „Ніва”.

9 770546 196000

Беларуса не пусцілі...

Беларуса не пусцілі ў Беларусь! Сама фраза гучыць абсурдна і недарэчна. Ну скажыце, што немца не пусцілі ў Нямеччыну, што ангельца не пусцілі ў Англію. Пра арабаў увогуле лепш не згадваць. Там ва ўсякую мусульманскую краіну яны могуць ездзіць не толькі без візы, але нават без пашпарта. Па твару пазнаюць, абдымуць, запросяць, накормяць. Чаркі, праўда, не нальюць, але толькі з тае прычыны, што рэлігія не дазваляе. А каб дазваляла, то і чарку налілі б.

Нашая рэлігія чарку дазваляе. Мала таго, яна лічыцца прыкметай нашай, нацыянальнай, беларускай гасціннасці. Ды ў нашай крыві, у нашых генах, гэтай гасціннасці аж занадта. Мы кожнага чужака прымем. Ну, а калі госць не чужак, а свой, блізкі, родны па крыві і духу, дык мы гатовы разбіцца, каб толькі дагадзіць. У нашым беларускім менталітэце гасціннасць з'яўляецца вышэйшай праявай чалавечнасці.

Мы чакалі яго, свайго сябра. Мы ўжо даўно не маладыя людзі. І нашае жыццё не было такім, каб здароўе прыбаўляла. Як кажуць у народзе, усе хваробы ад нерваў. Няма ўжо таго здароўя. Няма нават на тое, каб з'есці чаго смачнага, тлустага, вострага. Адразу ціск падскочыць. А пра алкаголь дык і размовы няма. Ён нам супрацьпаказаны як найвялікшая атрута, якая нашае жыццё скарачае прама прапарцыянальна выпітаму. Але халера з ім, тым жыццём, калі сябра да цябе прыязджае. Ды такія хвіліны і ёсць жыццё. Кожная мінута за год лічыцца. І таму, чакаючы прыезду свайго сябра, мы ўжо за тыдзень рыхтаваліся. Заправілі цэлы бак паліва, бо трэба ездзіць і працаваць, распрацавалі маршруты, каб сябра не згубіў ні адной хвіліны дарэмна. Ён паўгода плануе, што яму трэба зрабіць.

А нашы жонкі ходзяць па крамах, шукаюць добрую, і абавязкова беларускую гарэлку, хоць яна нам даўно супрацьпаказаная і даўно ўжо непатрэбная. І думаюць абавязкова пра беларускую кухню, якая, таксама на бульбе і сале, можа нас прыкончыць у кожную хвіліну яшчэ хутчэй, чым тая гарэлка. Але халера з ім, тым жыццём. І трасца з тым здароўем. Усё з павагай і пашанай робіцца, каб беларусу ў Беларусі ўсё было па-беларуску.

Каб было ўсё так, як нас сустракаюць беларусы па той бок мяжы, калі людзі кідаюць усе важныя справы і сустракаюць брата па духу — беларуса, з усімі элементамі нашай беларускай гасціннасці.

А яго не пусцілі. Не пусцілі ў краіну, якой ён жыве. Не пусцілі ў асяродак, які дзякуючы такім як ён яшчэ застаецца беларускім. Палякі зрабілі для сваіх карту паляка. Добра быць палякам. Нават калі ты жывеш у Беларусі, то палякам больш выгадна быць, чым беларусам. Бо за плячамі паляка цэлая краіна стаіць. Краіна, якая з'яўляецца членам Еўрасаюза, якая мае сваё меркаванне, свой уплыў на сусветную палітыку. Мае нармальнае разуменне разбудовы свайго грамадства. Таму і шануе кожнага паляка, які жыве на гэтай планеце. А калі той паляк па-польску гаварыць умее, то ўдвая шануе яго польская дзяржава.

Наш сябра ўмее гаварыць па-польску. Але яго бяда ў тым, што ён гаворыць і па-нашаму, па-беларуску. Не так, як начальнік краіны, не так як прэм'ер. Не так як беларускія памежнікі, якія ветлівы, без злобы, без прэтэнзій, але не пусцілі беларуса ў Беларусь.

Прыйдзе час, калі твая духоўная Бацькаўшчына, будзе ганарыцца тым, што ты да яе належыш.

Віктар САЗОНАЎ

Праўда, іначай пастронак Нерваля

З праўдай, якая б яна не была, заўсёды клопат. Заўсёды хтосьці за яе ўступіцца і заўсёды хтосьці таму супрацівіцца, абвяшчаючы зусім адваротную думку. А што з праўдай? Тым не менш, сутнасцю чалавечых спрэчак не з'яўляецца сама праўда і толькі праўда, а тое, хто меў рацыю. Гэты тэзіс пацвярджае прыклад Жэрара дэ Нерваля, геніяльнага французскага паэта, які цаніўся сваімі сучаснікамі не толькі за майстэрства паэтычнай фразы, але і за неверагодную вытанчанасць і цудоўнасць постацей; Бальзак спартрэтаваў яго нават у адной са сваіх навелак як „prince de Boheme". На жаль, Нерваль на схіле сваіх гадоў ашалеў.

Пакуль, аднак, стаў праходжвацца на парыжскіх вуліцах з жывым амарам на блакітнай вяровачцы, стварыў незабыўныя санеты „Les Chimeres" — незвычайныя, майстэрскія! Калі ў яго спыталіся, чаму шпацыруе з амарам, адказаў, што той не з'яўляецца чымсьці горшым за сабаку, якога вядуць на павадку. І так сур'ёзна даказваў: „Ён спакойны, сур'ёзны і ведае сакрэты мора, не брэша і не кусае людзей па лытках". Той ракападобны на павадку зусім не быў па-ягонаму доказам вар'яцтва. „Гётэ ж, — тлумачыў паэт, — не любіў сабак, а ніяк не быў шалёным!". Гэтая логіка, як ні кажы, слушная, даказваючая рацыю, якую слушна прывёў Шэкспір, што ў вар'яцтве ёсць метад. Праўда? Праўда!

Дарэчы, калі я расказаў гэты анекдот маёй сяброўцы з Белавежы, тая з павальнай логікай пракаментавала гэта наступным чынам: „Ды ж той бедны амар не шпацыраваў, яго жорстка валаклі і напэўна моцна ад гэтага пакутаваў!". І гэта таксама праўда!

Нерваль, некалькі дзён да свайго трагічнага канца, хоць ва ўсім Парыжы панавалі вялікія маразы, валачыўся з шынка ў шынок у жалюгодным сурдуціку падпаясаным шнурком. Ды не абы-якім пастронкам! Для яго той шнурок быў чымсьці асаблівым; з поўным перакананнем даказваў ён сябрам, што той з найлепшага шоўку і раней служыў як пасачак пані дэ Мантэнон — шматгадовай метрэсы і пасля марганатычнай жонкі „сонечнага" караля Францыі. І на гэтым шнурку ці паяску канчаткова павесіўся ў нейкім аблезлым шынку.

Пасля няслаўнай смерці Нерваля літаратуразнаўцаў найбольш заняла справа таго шнурка, а не яго паэтычная спадчына. Спрэчка пра тое, ці той ядвабны пастронак быў зроблены з кокана прыручанага як дзікая свіння матыля тутавага дрэва „Bombyx mori", а ў гэтым выпадку — ці яго кітайскага падвіду „Antheraea pernyi", ці японскага „Antheraea yamamai", ці індыйскага „Antheraea mylitta" — ці мо ўзяўся ён з тутавага какона павіных вочак з сямейства „Attacidae", мела працягвацца яшчэ пару дзесяткаў гадоў, прытым на розных узроўнях. Перакрочыўшы літаратуразнаўчую тэрыторыю, уцягнула ў дыскусію энтамолагаў, якія ў саюзе з этолагамі-біялагістамі па-

Жэрар дэ Нерваль
wikipedia.pl

чалі бой з групай варавітых этымолагаў, „et hoc genus omne". І кожны даказваў сваю ўласную праўду. Толькі што ні адзін з антаганістаў не звярнуў увагі на факт, што паэтычны геній Нерваля даўно зышоў ужо ў Элізіум і там, блукаючы па асфадэлевых лугах, з пагардай для трупа паэзіі, пакінутага тленнасці, зусім ён няўражлівы на левыя прычэпкі, грымакі, падступныя ўдары з галоўкі і выспяткі, якіх не шкадавалі адзін аднаму ўдзельнікі спрэчкі, ды якія, несумненна, кранулі добрае імя паэта. Мабыць, гэта не мяшала самой паэзіі, тым не менш факт ёсць фактам, і нічога, што суцяшае нас Гарацый, мовячы: „Etiam disiecti membra poetae" („Нават у пашарпанай постаці знойдзеце члены цела паэта").

Эх, каб так можна было сказаць пра Праўду!

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Непажаданы

23 мая Яўген Вапа, галоўны рэдактар „Нівы", старшыня Радыё „Рацыя" і Беларускага саюза ў РП не быў упушчаны ў Беларусь. Беларускія памежныя службы анулявалі яму візу і паставілі ў пашпарт штамп „Уезд забароены", што на практыцы абазначае бестэрміновую забарону ўезду. Пасля вартання з мяжы наш шэф тлумачыў:

— Я ехаў па запрашэнню Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына". Хацеў пабачыць на свае вочы як выглядае актуальная сітуацыя ў Беларусі. Пры нагодзе намерваўся набыць кніжкі і капмакт-дыскі, якія могуць спатрэбіцца многім асобам у Польшчы.

Забарону ўезду патлумачыў фактам, што з'яўляецца прадстаўнікам незалежных аб'ектыўных СМІ — „Рацыі" і „Нівы":

— Функцыянеры беларускай памежнай службы вялі сябе вельмі прыстойна ды не адказалі на маё пытанне. Адаслалі мяне ў пасольства РБ у Варшаве.

Дзень пасля адмовы ўезду, управа Радыё „Рацыя" выдала спецыяльны заклік. Можна было ў ім прачытаць: „Яўген Вапа з'яўляецца адначасова грамадскім дзеячам беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы і старшынёй Беларускага саюза ў РП. Таму дзеянні адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі ўспрымаем як акт агрэсіі супраць еўрапейскіх, дэмакратычных каштоўнасцей, не толькі супраць незалежных СМІ, але таксама і супраць асяроддзю беларускай меншасці ў Польшчы".

У той самы дзень спецыяльную заяву выдала таксама польскае Міністэрства замежных спраў, у якім выказала „вялікую трывогу" анулявaннем візы. Адзначана: „Лічым гэты інцыдэнт чарговым, побач арыштаванняў Анджэя Пачобута [зняволенага ў турме дзеяча Саюза палякаў у Беларусі — М. Х.], дзеяннем беларускіх улад накіраваным супраць свабоды слова. Яе абмежаванне лічым парушэннем асноўных свабод і грамадзянскіх правоў. Забарона ўезду ў Беларусь Вапу пацвярджае, што рэжым імкнецца да абмежавання доступу грамадзян да незалежнай інфармацыі ў той час, калі ў Беларусі паглыбляецца гаспадарчы крызіс і працягваюцца рэпрэсіі".

Здарэнне пракаментаваў таксам м.інш. віцэ-старшыня сеймавай камісіі замежных спраў, а заадно старшыня парламенцкай групы па справах Беларусі Роберт Тышкевіч:

— Гэта чарговы выпадак, калі ў Беларусь не можа ўехаць журналіст. Выглядае на тое, што Беларусь выбрала курс на самаізаляцыю. Успрымаем гэта з неспакоем і пачуццём трывогі, таму што Беларусь робіцца штораз больш закрытай.

Аляксей Зелянко, прэс-сакратар пасольства РБ у Варшаве энігматычна тлумачыў прычыны пазбаўлення магчымасці ўезду старшыні „Рацыі" і галоўнаму рэдактару „Нівы":

— У Беларусі, так як і ў кожнай іншай дзяржаве, існуе спісак асоб, якіх уезд на тэрыторыю краіны з'яўляецца непажаданым. Аднак у выпадку Беларусі не агучваем гэтага спіска. Адмаўленне ўезду на тэрыторыю Беларусі грамадзяніну іншай дзяржавы з'яўляецца суверэнным правам Беларусі і прытым наша рэспубліка не мае абавязку тлумачыцца з прычын, з-за якіх уезд быў забаронены.

Таксама на сайтах адмоўнае рашэнне выклікала шматлікія каментарыі. Напрыклад, у адной з сацыяльных сетей забарону ўезду ў РБ агучыла Анна Мяжынская, загадчыца беластоцкага дэпутацкага офіса Роберта Тышкевіча, ад імя свайго шэфа. А ў сваю чаргу вядучы дзеяч левага ўхілу з Беластока Міраслаў Гануш напісаў: „Мне ўезд забаронены ўжо многа гадоў. Як мне сказаў консул: „за спаленне партрэта Лукашэнкі"! А я ж — невінаваты! От, падпальвалі і не мелі запальнічкі, дык я ім яе пазычыў". Думаю, што калі сітуацыя, аб якой успамінае Міраслаў Гануш, гучыць нават жартоўна, дык выпадак Яўгена Вапы — сур'ёзны і прытым трывожна сур'ёзны.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

На Міколу ў Бельску-Падляшскім

Бельск-Падляшскі наведалі (злева) кароль Польшчы і вялікі літоўскі князь Аляксандр Ягелончык, каралева і вялікая княгіня Алена, першы падляшскі ваявода Іван Сапега

— Зараз (рэканструкцыя з 1505 года — А. М.) наведае нас кароль Польшчы і вялікі літоўскі князь Аляксандр Ягелончык, які нядаўна (ў 1495 годзе — А. М.) прысвоіў Бельску магдэбургскае права ды каралева і вялікая княгіня Алена (іх імёнамі названы паркі ў Бельску-Падляшскім — А. М.), — кажа 22 мая перад ратушай у Бельску-Падляшскім Дарафей Фіёнік, пераапрануты за бельскага патрыцыя Івана Сегяневіча. На ратушнай плошчы загадзя расстаўлены ларкі з народным рукадзеллем — разьбой па дрэве, глінянымі гаршкамі, саломапляценнем, карцінамі на шкле. Побач гучыць сярэднявечная музыка, якая выконваецца на музычных інструментах выкананых на вельмі даўні лад. Дзяўчаты і хлопцы выступаюць перад бельскай публікай з даўнімі танцамі. Кірмаш у веснавы дзень, калі ўшаноўваецца памяць свяціцеля Мікалая, гэта адзін з трох пастаянных кірмашоў, якія здаўна ладзіліся ў Бельску-Падляшскім.

Вялікае ўражанне на публіцы выклікаў ансамбль народнай песні „Гаманіна" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі ў Мінску

— Кірмашы ў дзень св. Мікалая Цудатворца ўжо ад сярэднявечча былі ўпісаны ў бельскую гістарычную традыцыю. У Бельску-Падляшскім быў Свята-Мікалаеўскі манастыр (тут дзе знаходзяцца Белліцэй і „тройка" — А. М.). Свяціцель Мікалай, гэта таксама патрон фарнага касцёла ў нашым горадзе. У яго гонар была збудавана часоўня на тэрыторыі „тройкі". У веснавы дзень, калі ўшаноўваецца памяць цудатворца Мікалая, пасля багаслужбы ў царкве, праходзіла працэсія па бельскіх вуліцах. Мы рашыліся абнавіць гістарычную традыцыю Бельска, наладзіць у гэты дзень кірмаш з вырабамі народных творцаў і ўпрыгожыць мерапрыемства канцэртамі народнай музыкі і гістарычнай інсцэніроўкай. Хочам паказаць рэканструкцыю пабыўкі ў Бельску караля Аляксандра Ягелончыка і яго жонкі, каралевы Алены, — заяўляе Дарафей Фіёнік, старшыня аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах", якое ў нядзелю наладзіла вялікае мерапрыемства побач гарадской ратушы, у парках імя караля Аляксандра Ягелончыка і каралевы Алены, а таксама па вуліцы Дубічы.

Бельскія святкаванні ў гонар свяціцеля Мікалая распачаліся ў Міхайлаўскай царкве з літургіі, якую ўзначаліў мітрафорны протаіерэй Лявонцій Тафілюк. Маліліся там людзі розных нацыянальнасцей, бо на ўрачыстасць прыбылі народныя творцы, музыкі і танцоры з Польшчы, Беларусі, Латвіі і Літвы. Пасля працэсія ў малітоўным настроі перайшла з царквы пад Мікалаеўскую часоўню каля школьнага будынка „тройкі" і там сабраныя памаліліся да цудатворца Мікалая, апекуна падарожнікаў, купцоў і заступніка людзей, якія ў шчырых малітвах звяртаюцца да святога. Яму ў літургічнай традыцыі прысвячаецца асобны дзень — чацвер. Гэта быў таксама дзень бельскіх купцоў, якія здаўна збіраюцца тады на бельскім рынку дзеля продажы або куплі. У святочную нядзелю бяльшчане прыйшлі на ратушную плошчу, пабывалі ў гарадскіх парках дзеля ўдзелу ў гістарычнай інсцэніроўцы і добрай гульні з народнай музыкай.

Калі кароль Аляксандр Ягелончык і каралева Алена селі на падрыхтаваныя ім побач ратушы крэслы, каля іх затрымаўся першы падляшскі ваявода Іван Сапега, якога таксама прывіталі з належнай пашанай. У гістарычную вопратку, выкананую на даўні лад і прывезеную ў Бельск спецыяльна на мерапрыемства, пераапрануты былі таксама бельскі намеснік Солтан Александровіч, арандатар бельскай мытнай каморы Міхель Эзафовіч, жонкі гістарычных постацей і дваранкі, якія стаялі на сонцы ў час вельмі цёплага надвор'я.

— У XVI стагоддзі значэнне Бельска ўзрасло да ўзроўню аднаго з самых важных гарадоў Вялікага Княства Літоўскага. На бельскім замку ў 1564 годзе праходзіў агульны літоўскі сойм, у час якога быў рэдагаваны тэкст другога Літоўскага статута, прынятага ў 1566 годзе. Вялікае значэнне для развіцця горада мелі кароль Аляксандр Ягелончык, які прысвоіў Бельску магдэбургскае права, а таксама каралевы Алена, Бона і Анна Ягелонка. Багаты кожны этап развіцця нашага горада маглі б даследаваць гісторыкі, археолагі, сацыёлагі, культуразнаўцы ці літаратуразнаўцы. Мяркуецца, што на падставе бельскага мяшчанства можна даследаваць працэсы, якія адбыліся сярод гэтай грамадскай праслойкі ў цэнтральнай і ўсходняй Еўропе, — лічыць Дарафей Фіёнік.

Важнымі момантамі бельскіх святкаванняў былі канцэрты народнай музыкі ў некалькіх месцах горада, у час якіх можна было слухаць, між іншым, песні на беларускай, расійскай, польскай, яўрэйскай, нямецкай і латышскай мовах. Першымі на ратушнай плошчы супольна выступілі калектывы „Aqua Profunda" (капэла) і „Histrion" (танцоры) з Мінска, якія запрэзентавалі музыку і танцы эпохі рэнесансу. Гурт „Aqua Profunda" суправаджаў таксама караля і каралеву, калі тыя прагульваліся па Бельску і выступаў перад бяльшчанамі пазней.

— Мы стварылі калектыў індывідуальна, не карыстаемся падтрымкай ніякай установы, толькі самі шукаем сабе спонсараў, — заявіў кіраўнік калектыву „Aqua Profunda" Антон Глінясты. — У нашым рэпертуары многа сярэднявечнай музыкі.

Вялікае ўражанне на публіцы выклікаў ансамбль народнай песні „Гаманіна" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі з Мінска, у якім выступілі студэнты і выкладчыкі гэтай вышэйшай установы. Ансамбль выступіў дзень раней з вялікім канцэртам у Орлі, у дзень апостала Іаана Багаслова. Спевы, танцы і выступ інструментальнай капэлы „Гаманіны" развесялялі бяльшчан не толькі перад ратушай, але і ў гарадскім парку.

— Мы паказваем перш за ўсё народную музыку і народныя танцы XIX і XX стагоддзяў. У нашым рэпертуары маецца таксама сярэднявечная музыка. Мы вельмі рады, што вашая публіка ведае беларускі народны рэпертуар і можа супольна з намі заспяваць беларускія песні, чаго нельга сказаць, напрыклад, пра мінскую публіку, якая часта толькі знаёміцца з фальклорам, — сказала кіраўнік „Гаманіны" Наталля Сазановіч.

„Сям'я Клінтсаў" з Рыгі спявала на латышскай мове, расійскую музыку паказаў гурт „Быліна" з Літвы, польскую, украінскую і старанямецкую музыку запрэзентавала „Schola" Тэатра Венгайты, а з жыдоўскай музыкай выступіў калектыў „Young Folk Crew" з Беластока.

На ратушнай плошчы супольна выступілі калектывы „Aqua Profunda" (капэла) і „Histrion" (танцоры) з Мінска

У 2010 годзе аб'яднанне „Музей малой айчыны" было адным са стваральнікаў агульнаваяводскага праекта „Жывем супольна" і збірала інфармацыю аб жыцці яўрэяў у Бельску-Падляшскім. Працы, якія ўзніклі ў час бельскіх майстар-класаў, былі выбраны на зборную выстаўку „Жывем супольна". Адкрыў яе ў Бельску дырэктар Дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Маршалкоўскай управы Анатоль Вап, звяртаючы ўвагу на цікавыя мастацкія работы, якія паказваюць на шматкультурнасць Падляшша. Менавіта намер адкрыцця гэтай экспазіцыі стаў зручнай нагодай для гістарычнай інсцэніроўкі, кірмашу і канцэртаў народнай музыкі ў Бельску. Прадбачваецца таксама выдаць кніжку, якая падвядзе вынікі праекта „Жывем супольна".

Народнае рукадзелле прэзентавалі творцы з Беларусі, Літвы, Латвіі і Польшчы

Заява МГА ЗБС „Бацькаўшчына” Міністру замежных спраў Беларусі Сяргею Мартынаву

Паважаны
Сяргей Мікалаевіч!

Міжнароднае грамадскае аб'яднанне „Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына” выказвае занепакоенасць з нагоды анулявання ўязной візы ў Рэспубліку Беларусь Яўгену Вапу — старшыні ўправы „Радыё Рацыя” і галоўнаму рэдактару Тыднёвіка беларусаў у Польшчы „Ніва”.

Яўген Вапа з'яўляецца сябрам Вялікай Рады Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына”, і віза на ўезд у Рэспубліку Беларусь была аформлена па запрашэнні Згуртавання „Бацькаўшчына”.

Яўген Вапа з'яўляецца актыўным грамадскім дзеячам беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, старшынёй Беларускага саюза ў Польшчы. Шмат у чым дзякуючы яго дзейнасці беларуская меншасць у Беласточчыне захавалася і актыўна дзейнічае на грамадска-культурнай ніве.

Акрамя таго, мы хацелі б звярнуць увагу на тое, што Яўген Вапа ўваходзіць у склад Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. Другое пасяджэнне Кансультатыўнага савета адбудзецца 9 ліпеня 2011 года ў межах Першага фестывалю мастацтваў беларусаў свету. Відавочна, што не маючы візы Яўген Вапа не зможа ўзяць удзелу ў пасяджэнні Кансультатыўнага савета.

Пры анулявані візы Яўгену Вапу беларускія памежныя службы паведамілі, што пра прычыны гэтага рашэння можна даведацца ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Варшаве. Аднак беларускае пасольства адмовілася назваць гэтыя прычыны.

Пасля V з'езда беларусаў свету, што ладзіла МГА „ЗБС „Бацькаўшчына” ў 2009 г., назіраліся тэндэнцыі па актывізацыі працы дзяржаўных органаў з беларускай дыяспарай. І гэта было вельмі станоўча ўспрынята беларускімі асяродкамі за мяжой. Аднак выпадак з анулявaннем візы Яўгену Вапу можа быць ацэнены беларускай дыяспарай як крок назад з боку нашай дзяржавы.

У сувязі з гэтым Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына” звяртаецца ў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь з настойлівай просьбай патлумачыць прычыны анулявання ўязной візы сябру Вялікай Рады МГА „ЗБС „Бацькаўшчына” Яўгену Вапу.

З павагай,
Старшыня Рады МГА ЗБС „Бацькаўшчына”
Н.А. Шыдлоўская

Міра ЛУКША

„ПАЗНАЕМ БЕЛАРУСЬ”

Калі вы цікавіліся гісторыяй і культурай Беларусі, яе сучасным жыццём, калі вы актыўныя творчыя асобы, прапанаваў вам удзел у конкурсе „Пазнай Беларусь” Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча. Мэтай конкурсу з'яўляецца папулярызацыя сярод маладога пакалення беларусаў у Польшчы ведаў пра культуру, гісторыю і сучаснасць Беларусі, садзейнічанне рэалізацыі яго творчага патэнцыялу і зацікаўленне праблемай захавання нацыянальнай самасвядомасці.

У конкурсе маглі прымаць удзел вучні, творчыя калектывы, гурткі навучальных устаноў у Польшчы з дадатковым вывучэннем беларускай мовы ва ўзросце ад 4 да 19 гадоў. Да ўдзелу ў конкурсе прымаліся працы не толькі на беларускай мове. Конкурс праводзіўся па наступных намінацыях: лепшы малюнак пра Беларусь, фотаздымак аб Беларусі; літаратурна-паэтычны твор (апавяданні, вершы, замалёўкі і г.д.) і сачыненне „Беларусь і беларускасць у гісторыі маёй сям'і”. Кожны ўдзельнік конкурсу мае быць адзначаны ганаровым дыпломам, а пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца каштоўнымі прызамі, выдадзены будзе таксама плён конкурсу ў выглядзе зборніка.

На конкурс прысланы былі 374 працы вучняў, пачынаючы ад дашкольнікаў, канчаючы на ліцэістах, створаныя ў школе, у мастацкіх і іншых гуртках, і без апекуноў.

У намінацыі **Малюнак пра Беларусь** было найбольш прац, асабліва сярод найменшых удзельнікаў. Найчасцей працы высылаліся гуртом, часта ад школы або настаўніка або мастацкага клуба, хоць выбар тэмы і яе паказ залежаў ад удзельніка. **На жаль, некаторыя працы, у якіх вучань змяшчаў напрыклад „гістарычныя каштоўнасці Беларусі” (бел-чырвона-белы сцяг і герб Пагоня — рэд.) былі адкладзены на бок не зусім па мастацкай прычыне.** Найцікавей ацаніліся працы вучняў у катэгорыі ***5-7*** гадоў з Дзіцячага садка № 14 у Беластоку і Комплексу школ з ДНБМ імя Я. Кастыцэвіча ў Бельску-Падляшскім. Тут перамаглі: І месца — Аляксандра Брэчка (7 г., *Дзяўчына-беларуска*) і ІІ — Анна Гадунская (7 г., *Прыляцелі буслы)* з Комплексу школ з ДНБМ у Бельску-Падляшскім, ІІІ — Юлія Баравік (6 г., *Бабуля і дзядуля*) і Кацярына Якімюк (6 г., *На сяле*) з Прадшколля № 14 у Беластоку.

У катэгорыі ***8-12*** гадоў найлепшай паказалася мінулагодняя лаўрэатка з Гарадка Аляксандра Яроцкая (10 г., *Беларуская хатка*). Затым вылучыўся Бельск-Падляшскі, а вучні з ПШ № 3 занялі вядучыя месцы: Кацярына Лукашук (10 г., *Малітва за Беларусь*) — другое, і трэцяе — Крыстафор Лушчынскі (11 г., *Беларуская хатка прабабулі Надзеі*), а вылучаны былі яшчэ бяльшчане Адам Стэпанюк (9 г., *Прыляцелі буслы*) і Юлія Банькоўская (10 г., *Прыпяць у Пінску*) з Пасялковага дома культуры, Сара Паўлоўская (9 г., *Танцуюць беларусы*) з мастацкага кружка „Калаж” і Крыстыян Адам Веснюк (11 г., *Танцуюць беларусы*) з мастацкага кружка „Калаж”.

Сярод удзельнікаў конкурсу ў катэгорыі ***13-15*** гадоў вельмі вылучылася каларытна-публіцыстычная праца Малгажаты Баўтручук (15 г. *Лавачка — месца сустрэч бабуляў)* з Гімназіі № 3 у Гайнаўцы (І месца). Анна Скепка (14 г.) з Комплексу школ з ДНБМ у Гайнаўцы намалявала возера *У Семяноўцы* (ІІ месца).

Удзельнікі ў катэгорыі ***16-19*** гадоў выканалі выдатныя працы алеем ды вышыўкай. Матэвуш Якімовіч (17 г.) з Бельскага белліцэя перамог сваёй працай *Праваслаўная царква ў Беларусі*. Таксама ў алеі на палатне выканана праца Наталлі Скепка *Лебядзінае возера* (17 г.) з Гайнаўскага белліцэя, а вышыўка *Сімвалы вышыўкі* Малгажаты Чыжэўскай (17 г.) з Гайнаўскага белліцэя ацанілася на трэцім месцы. Вылучана была карціна *Божая Маці* арляніна Оскара Цюлькевіча (17 г.), вучня Бельскага белліцэя.

Вельмі цяжкі быў адбор сярод **Фотаздымкаў**; вучні фатаграфавалі Беларусь і тутэйшую беларушчыну. У намінацыі ў катэгорыі ***8-12*** гадоў перамагла Ганна Хомчук (12 г., 4 фота *Помнікі мінуўшчыны*) з Комплексу школ з ДНБМ № 3 у Гайнаўцы. Чатыры фатаграфіі Максіма Фіёніка (10 г.) — *Таіса ў жніўнай калысцы, Жніво на Падляшшы, Ілля ў дарозе на поле, Карагод* з мастацкага гуртка „Калаж” БДК у Бельску-Падляшскім вылучаліся спеласцю падыходу і ўмеласцю фатаграфаваць людзей у руху (ІІ месца). Наталля Мусюк (11 г.) з Комплексу школ № 3 з ДНБМ у Гайнаўцы запрапанавала 3 фота *Родам з Кляшчэль* (ІІІ месца). У катэгорыі ***13-15*** гадоў перамагла Караліна Таранта (15 г.) з Комплексу школ з ДНБМ у Орлі. З багатай падборкі яе фота вылучаўся перш за ўсё здымак *Галубы крыж каля бярозы*. Юстына Тамашук-Спірыдовіч з Рэпіскаў з Гімназіі ў Дубінах (14 г.) за тры фота *Зачараванае возера* была адзначана ІІ месцам. Крыстына Баршчэўская (15 г.) з Комплексу школ з ДНБМ у Орлі за нізку здымкаў *На панадворку* ацэнена была на ІІІ месцы; вылучана была яе сяброўка Вікторыя Карунас (14 г.) за тужлівыя здымкі *Нашае мінулае*. У катэгорыі ***16-19*** гадоў у змаганні „плячо ў плячо” перамаглі бельскія беліцэісты Аніта Яблушэўская (16 г.) шасцю здымкамі *У Хатыні цішыня* (І месца) і Тамаш Маркевіч (17 г.) трыма фота *Бельская беларуска ў Мінску* (ІІ месца) і арлянін Оскар Цюлькевіч (17 г.) двума фота *Вочы Беларусі* (ІІІ месца), на трэцім месцы вылучаны і Барташ Нічыпарук (16 г.) за 6 фота *У вокнах бабулі* з Гайнаўскага белліцэя.

Абсалютна перамог у намінацыі **Беларусь і беларускасць у гісторыі маёй сям'і** ды **мастацкія творы** ў катэгорыі ***8-12*** гадоў сваім сачыненнем Якуб Ваўрусевіч з Пачатковай школы № 3 у Бельску-Падляшскім, а вылучана было эсэ Патрыцыі Снарскай (12 г.) з Шудзялава з Клуба беларускай мовы. За паэтычныя творы былі ўзнагароджаны вучні з Комплексу школ з ДНБМ у Бельску-Падляшскім: І месцам — Вераніка Кубай (10 г.) за верш *Беларусь*, ІІ — Крыстафор Лушчынскі (11 г.) за верш *Беларусь*, ІІІ — Уршуля Амбражэвіч (10 г.) за верш *Лета на Беларусі*; вылучэннем — Магдалена Дунікоўская (10 г.) за верш *Радзіма*. Сачыненне *Беларусь — радзіма маіх прадзедаў* Дамінікі Раманюк (15 г.) з Вілюкоў, з гімназіі ў Дубічах-Царкоўных перамагло ў катэгорыі ***13-15*** гадоў. Добра ацэнены былі працы вучняў з Комплексу школ з ДНБМ у Гайнаўцы: Дар'і Шыманюк (15 г.) сачыненне *Беларускасць у маёй сям'і* (ІІ месца); за паэтычныя творы ўзнагароджаны яе калегі: ІІ месцам — Мірон Марчук (15 г.) за верш *Беларус*, ІІІ — Магдалена Раманюк (15 г.) за верш *Не дазволім*. У катэгорыі ***16-19*** гадоў найбольш спелымі былі вершы *О, Беларусь!* Кацярыны Старчэўскай (16 г.) з Гімназіі № 3 у Бельску-Падляшскім (І месца); верш *Беларусь мая!* арлянкі Касі Буйнюк (17 г.) з Бельскага белліцэя (ІІ); верш *Семяноўка* Паўла Марыюша Бірыцкага з Семяноўкі (18 г.) з Гайнаўскага белліцэя.

Падвядзенне вынікаў конкурсу адбылося 25 мая ў Драматычным тэатры імя Аляксандра Вянгеркі ў Беластоку. Урачыстасць пачала пастаноўка лаўрэата І месца тэатральнага агляду, трупы з дзіцячага садка № 14 Беластоку — п'еса „Паравіны года”. Выступілі таксама Іза Карчэўская, дзяўчаты са Студыі песні ў Гайнаўцы, настаўніцы садка № 14 ды ансамбль „Гарадзенскія карункі” з мастацкага каледжу ў Гродне.

Пазнай Беларусь

З 1986 года, калі я першы раз паехаў у Беларусь, у Гродна, адчуў тады сябе шчаслівым чалавекам. 25 гадоў, калі толькі была магчымасць, падарожнічаў я на сваю духоўную Бацькаўшчыну.

Нягледзячы на ўсе палітычныя абставіны, заўсёды ўпэўнена паўтараў, што няма прыгажэйшага месца на зямлі за беларускія краявіды. Шмат якіх месц на карце Беларусі яшчэ не зведаў, шмат якіх людзей хацеў сустрэць у час сваіх падарожжаў. Мая Беларусь заўсёды была і будзе пад бел-чырвона-белым сцягам і гербам Пагоня. Забарону ўезду для мяне на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь лічу крывадушнасцю ўлады, якая не шануе амбасадараў беларускасці па-за яе межамі, а значыць — беларускую нацыянальную меншасць у Польшчы.

Яўген ВАПА

Ілона КАРПЮК

Біенале культур

Танцавалі сярэднявечныя беларускія танцы да музыкі „Старога Ольсы", спявалі вяснянкі, а таксама займаліся рукадзеллем. Школьнікі, якія прыйшлі сёлета на чарговы выпуск „Біенале дзіцячага мастацтва" ў Познані, маглі прыняць удзел таксама ў беларускіх майстар-класах і трэба сказаць, што з ахвотай гэта рабілі.

Фота Радка ДАМБРОЎСКАГА

Васемнаццаты раз Цэнтр дзіцячага мастацтва ў сталіцы заходняй Польшчы, у Познані, зладзіў мерапрыемства, якое з'яўляецца арыгінальнай і шматвектарнай формай дыскусіі на дзіцячыя тэмы. Сведчыць пра гэта ў першую чаргу арганізатарская задума наконт кшталту цэлай ініцыятывы.

— Займаюся навукова якраз дзіцячай літаратурай, — гаворыць Анна Чэрнаў з Варшаўскага ўніверсітэта. — Запрасілі тут мяне ды іншых навукоўцаў, каб сачыць за падзеямі Біенале. Наша галоўная задача — напісаць пасля адмысловыя артыкулы, якія ўвойдуць у публікацыю, але ў час самога мерапрыемства таксама прымаем удзел у дыскусіях, праводзім апытанні сярод дзяцей, бацькоў, назіраем за формамі майстар-класаў.

Фота Ілоны КАРПЮК

Анну Чэрнаў пазналі мы, бо даволі часта адведвала наш намёт гульняў. Аказалася, што да беларускасці яе цягне, бо ейная сям'я па паходжанні беларуска-расейская. Гавару *мы*, бо супольна са мною ў Познань паехала Аліна Ваўранюк, настаўніца, якая штодзень працуе з дзяцьмі ды актыўна арганізуе дзейнасць аб'яднання бацькоў „АБ-БА". Як беларускія аніматары сустваралі мы „Вёску на скрыжаванні культур", бо такую ідэю — стварыць месца шматкультурнай сустрэчы з традыцыяй — арганізатары паставілі сёлета сваёй галоўнай мэтай.

Фота Радка ДАМБРОЎСКАГА

Пра традыцыю ў працэсе адукацыі шмат гутараць у час цэлага Біенале, якое надалей працягваецца. Беларускія майстар-класы, побач афрыканскіх, іспанскіх, партугальскіх, нямецкіх ці жыдоўскіх, гэта толькі невялічкая частка Біенале. Цэласць праграмы пабудаваная так, каб можна было прапанаваць нешта канкрэтным групам дзяцей, каб паказваць разнароднасць форм адукацыі шляхам гульні, каб мець дастаткова часу на абмяркоўванне пытанняў і падзей у дзіцячай адукацыі за апошні год, а таксама каб паказваць шмат чаго публіцы, якая ці гэта мэтанакіравана, ці выпадкова пападзе на нейкія падзеі, якіх кульмінацыя зладжана ў форме фестывалю. А калі фестываль, дык там ужо ўсё: танцы, спевы, кіно, жывапіс. Ёсць адчуванне, што гэта найбольшае ў Польшчы такое свята дзяцей, у якое ангажуецца цэлы Познань. Вялікай вартасцю Біенале з'яўляюцца інструктары, якія прыязджаюць з усёй краіны, нават з замежжа, каб дзяліцца сваім педагагічным і мастацкім вопытам ды паказваюць дзецям самыя цікавыя элементы розных культур.

„Лёля, Лель і Ляля" гэта постаці падабраныя з беларускай міфалогіі, якія сталі сімвалам беларускіх майстар-класаў. Вяжуць з сабой тэмы дзіцячыя і вясновыя, таму ўдзельнікі беларускіх гульняў па-першае вучыліся спяваць вяснянкі, прабавалі гукаць вясну ды вадзілі карагод. Дзяўчаткі рабілі кветкі, якія пасля пераўтвараліся ў вянок Лялі, а хлопцы, як у натхненні, плялі з воўны прыгожыя ромбікі. На ільняным палатне частка іх прац прэзентавалася ў намёце, дзе прайшло супольнае завяршэнне майстар-класаў. Там узнікла сапраўдная „вёска на скрыжаванні культур". Нямецкай мове ўсе супольна вучыліся пры дапамозе казкі пра рыбака і залатую рыбку, партугальскія традыцыі пахлі папяровымі сардзінамі. З Іспаніі прыехала казка пра катоў, якіх танцаваць на талерках вучыў „Пан Мелітон". Афрыка гучала на ўсе бакі гукамі джэмбле і іншых традыцыйных інструментаў, але рытмы „Чорнай зямлі" пасябравалі таксама з рытмамі беларускага карагода, які не менш ахвотна склалі дзеці і дарослыя. Карагод папярэдзіў супольны танец, у час якога ўсе шукалі адказу на пытанне: „Ці Дракула з Беларусі?". На канец яшчэ ўсе паслухалі сольны мініканцэрт на морквах, перцах, агурках і какосах.

Усё гэта напэўна гучыць трохі незразумела, але гэта і паказчык, што ў дзіцячым свеце не ўсё так відавочнае з пункту гледжання дарослых. Між іншым вядучыя майстар-класы ў час XVIII Біенале дзіцячага мастацтва ў Познані стараліся даказаць ды паказаць таксама бацькам і настаўнікам, якія кожнага дня наведвалі чарговыя культурныя намёты.

Фота Радка ДАМБРОЎСКАГА

— XVIII Біенале запрашае зазірнуць у прошлае, — гаворыць Ежы Машковіч, дырэктар Цэнтра дзіцячага мастацтва ў Познані. — Я перакананы, што там сапраўдныя скарбы для дзяцей, што даўняе неабавязкова абазначае мёртвае, а наадварот — традыцыйная культура можа быць выдатнай крыніцай інспірацыі, ведаў і радасці. Трэба толькі яе нанава адкрываць, перапрацоўваць, аднак далікатна, каб нічога не папсаваць, бо як сказаў амерыканскі паэт Эзра Поўнд „традыцыя гэта прыгажосць, якую захоўваем, а не путы, якія нас абмяжоўваюць".

Ныцікі

Час ад часу ў нашым асяроддзі адзываецца то адзін, то другі ныцік, якім не падабаецца ўсё, што робяць нашы культурна-асветныя ўстановы, напрыклад, гмінныя асяродкі ці павятовыя дамы культуры, а нават Беларускае грамадска-культурнае таварыства.

Здавалася б, трэба цешыцца, што ладзяцца ў нас конкурсы беларускай песні, агляды калядак, фэсты, дэкламатарскія спаборніцтвы, канцэрты, што прыцягваюць яны шматлікую публіку. А гэта ў сваю чаргу доказ, што такія мерапрыемствы нашаму народу патрэбныя. На жаль, знаходзяцца ў нас ныцікі, якія ўвесь час крыўляюцца: а то мерапрыемства адбылося ў будынку блізкім руіны, а то зышлося трохі бабуляў і дзядуляў, а то панікідная публіка сабралася.

Хачу такім ныцікам сказаць, што на беларускіх мерапрыемствах выступаюць папулярныя мастацкія калектывы, якія гуртуюць людзей усіх узростаў. І, на вялікую ўсім радасць, сярод выканаўцаў здараюцца і старэнькія, пасівелыя бабулі, якія на сцэне адчуваюць сябе самаўпэўнена, бадзёра, прыгожа. І гэта нікому не перашкаджае, бо на фестывалях, аглядах, канцэртах прысутнічае тысячная публіка, а людзі прыходзяць цэлымі сем'ямі.

Я быў гледачом шматлікіх конкурсаў, аглядаў, фестываляў і ў Беластоку, і ў Гайнаўцы і ўражанні ад іх у мяне станоўчыя. Рэпертуар і бабулек, і моладзі, і маленькіх дашкольнікаў мне вельмі падабаецца. Мы, гледачы, любім усіх выканаўцаў і імкнемся прыняць іх так, каб яны адчувалі сябе патрэбнымі, з павагай.

А ныцікам усё не падабаецца. Сядзяць яны, задраўшы нос, уяўляюць сябе вялікімі разумнікамі ды наракаюць і папракаюць, нават бабулек-артыстак, якія робяць нашае жыццё прыгожым і радасным. Не ведаю чым кіруюцца людзі, якія ўвесь час ныюць, на ўсё скардзяцца. Відаць, ныцікі здараюцца заўсёды і ўсюды. У нас таксама!

В. Б.

Патрэбныя прыстрэшкі

У Беластоку па вуліцы 27 Ліпеня ёсць восем аўтобусных прыпынкаў гарадскога транспарту. У мінулым годзе на гэтай доўгай вуліцы адрамантавалі асфальтавую маставую і пабудавалі новае электраасвятленне. Сёлета закончылі пабудову веласіпеднай сцежкі ад папраўчага дома да былой вялікай цяпліцы пры канцы вуліцы.

Зараз на некаторых прыпынках гарадскога транспарту стаяць толькі слупкі з раскладамі язды, сям-там з лавачкай, а дашкаў няма. Прыстрэшкі вельмі патрэбныя, лавачкі таксама. Неабходна паставіць пяць прыстрэшкаў ды адрамантаваць мініпачакальню ў канцы вуліцы на перыферыі горада. **(яц)**

ПАДЗЯКА

Рэдакцыя „Нівы"

сардэчна дзякуе ўсім нашым чытачам, сябрам, установам, якія павіншавалі нас з Юбілеем 55-годдзя

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Трыста спевакоў і пустыя месцы!

— Дзеці выконваюць задумы дарослага чалавека, — кажа Генадзь Шэмет, настаўнік музыкі. — Трэба ім падбіраць песні з густам. І ў першую чаргу навучаць класіку беларускай культуры.

Вось дзеткі з праваслаўнай школы ў Беластоку здзівілі звычайнай прапановай. Яны заспявалі твор на словы Канстанцыі Буйло „Люблю наш край старонку гэту". Калі тыдзень пасля фестывалю мы сустрэліся ў іх школе, другакласнікі яшчэ раз заспявалі мне гэтую песню, а дзеля прыгажэйшага выканання яны запрасілі калегу з чацвёртага класа, каб той падыграў ім на піяніна. Добра, калі песні з аглядаў і конкурсаў застаюцца ў сэрцах дзяцей. І калі яны дапамагаюць зразумець беларускую культуру і нашае адчуванне прыгажосці. І калі яны вучаць сяброўству.

— Усе дзеці маюць музычны слых, пачуццё рытму, — кажа Генадзь Шэмет. — Праўда, у адных атрымоўваецца хутчэй, з іншымі трэба працаваць больш часу. Я магу сказаць, што ўсе беларусы адчуваюць песню і музыку.

Вядома, каб дасягнуць поспех, трэба шмат працаваць. У час цэнтральнага конкурсу „Беларуская песня" для школьнікаў усе гаварылі пра Гайнаўку. Яшчэ да выступлення мы пазнёміліся з гімназісткамі Мартай Іванюк, Аляксандрай Грыгарук, Эвелінай Даковіч, Марленай Беглюк, Юліцай Ваўранюк і Паўлінай Нічыпарук. Дзяўчаты падрыхтавалі песню „Маміна сарочка" з рэпертуару „Прымакоў". Самі выбралі гэты твор, бо ён падабаецца па словах і мелодыі. Гурт працуе у Гайнаўскім доме культуры пад кірункам Марты Грэдаль-Іванюк. Выступленне дзяўчатак высока ацаніла камісія, якая, паводле многіх, у гэтым годзе была надзвычай патрабавальнай (старшыня — Юстына Пажазінская, члены — Анна Васькоўская, Марыюш Харужы). У конкурсе прынялі ўдзел 62 выканаўчыя адзінкі, гэта за трыста маладых спевакоў з прадшколляў, падставовых школ, гімназій і гурткоў, што працуюць у дамах культуры. Новай з'явай у музычным жыцці Падляшша была прысутнасць спевакоў з Міхалова (падрыхтаваў іх новы кіраўнік Дома культуры, таленавіты Юрка Астапчук, лідар самага папулярнага ў нас калектыву „Прымакі"), Дубровы-Беластоцкай, Сабалева, Шудзялава...

Конкурс арганізавала Таварыства беларускай культуры і БГКТ 20 мая г.г. у Бельску-Падляшскім. Месца паспрыяла маладым спевакам і іх апекунам. Самую прэстыжную ўзнагароду, пяцьсот злотых, фундаваў бурмістр Бельска. Атрымалі яе „Жэўжыкі" з бельскай „тройкі" — дзіцячы гурт, які спявае песні ад навакольных вёсак. Калі пра ўзнагароды — у нашай беларускай традыцыі грошы не спрыяюць развіццю калектываў. Калі б арганізатары ў якасці ўзнагароды прапанавалі найбольш спеламу калектыву запіс на CD, тады ад такога гурту застаўся б канкрэтны след. Школьныя гурты існуюць вельмі коратка, часта пасля заканчэння школы шмат мяняецца або ўсё канчаецца. Я, напрыклад, з найбольшым сентыментам успамінаю гарадоцкую „Казку" з салістамі Лукашам Зіневічам, Оляй Карпюк і Аняй Трахімчык. Сёння гэты гурт мае зусім іншы састаў, гучанне, касцюмы. Штосьці беззваротна прамінула! Такі важны момант злавілі ў беластоцкім беларускім садку. Там запісалі кампакт-дыск „Вясёлкі" ў момант іх музычнага апагея. Сёння спевакі ідуць далей і, як відаць па выніках конкурсу, іх музычная культура развіваецца.

Тыя, што прачытаюць вынікі, прыкмецяць, што ў многіх катэгорыях камісія не назначыла першага месца. Што гэта абазначае? Тое, што ў многіх выпадках трэба яшчэ падцягнуцца!

А вось вынікі цэнтральнага конкурсу „Беларуская песня":

Гран-пры — *Іза Карчэўская* з Гайнаўскага дома культуры (ГДК).

Катэгорыя класаў 0-III:

Салісты: I месца — Кацярына Дружба з ГДК; II месца — Ева Яканюк з ГДК, Юліта Баравік з Прадшколля № 14 у Беластоку; III месца — Андрэй Такаюк, Ксенія Клімюк, Кацярына Якімюк, усе з Прадшколля № 14 у Беластоку; вылучэнні — Беата Спас, Габрыся Такаюк, Іаанна Мусюк з Прадшколля № 14 у Беластоку, Зося Конюх з ПШ № 4 у Беластоку.

Дуэты-квартэты: II месца — Магдалена Ігнатовіч і Оля Галёнка з Прадшколля № 1 у Бельску-Падляшскім, „Антракт" з Бельскага дома культуры; III месца — Мая Аксантовіч і Роберт Куптэль з Орлі, квартэт

Дзяўчаты з Гайнаўскага дома культуры

з Прадшколля № 14 у Беластоку; вылучэнні — трыо з Вясковага дома культуры ў Рыбалах.

Катэгорыя класаў IV-VI:

Салісты: II месца — Юлія Кузыка з Непублічнай школы Кірылы і Мяфодзія ў Беластоку; III месца — Кацярына Куптэль з Орлі, Павел Якімюк з ПШ № 4 у Беластоку; вылучэнні — Кінга Вітомская з ПШ у Дубінах.

Дуэты-тэрцэты: III месца — Дар'я Якімюк і Іза Расткоўская з ПШ імя А. Міцкевіча ў Бельску-Падляшскім.

Катэгорыя гімназічных класаў:

Салісты: I месца — Паўліна Нікалаюк з ГДК, Аліцыя Перавой з Комплексу школ № 3 у Бельску-Падляшскім; II месца — Юліта Ваўранюк з ГДК, Наталля Ракіцкая з Комплексу школ № 3 у Бельску-Падляшскім; III месца — Марлена Беглюк з ГДК; вылучэнні — Кацярына Суліма з Дубровы-Беластоцкай, Эвеліна Даковіч з ГДК, Матэвуш Харкевіч з Белгімназіі ў Гайнаўцы.

Дуэты-тэрцэты: II месца — Магдалена Маліноўская і Магдалена Сахарчук з Комплексу школ № 3 у Бельску-Падляшскім; III месца — Магдалена Якімюк і Каміля Юзвюк ў Гімназіі імя А. Міцкевіча ў Бельску-Падляшскім; вылучэнне — трыо з Вясковага дома культуры ў Рыбалах.

Калектыў з Дубін з купалінкай на сцэне

Катэгорыя калектывы:

I месца — „Жэўжыкі" і гурт „Капры" з Комплексу школ № 3 у Бельску-Падляшскім, II — „Вясёлка" з Прадшколля № 14 у Беластоку і калектыў са Студыі эстраднай песні пры ГДК; III — гурт са Студыі АБ-БА ў Беластоку і гурт „Пэрла" з Нарваўскага асяродка культуры ў Нарве; вылучэнні — гурт „Казка" з Гарадка і калектыў са школы ў Орлі.

Катэгорыя хары:

II месца — „Камертон" з Комплексу школ у Аўгустове і Вясёлка" з Прадшколля № 14 у Беластоку; III месца — хор са школы ў Дубінах. Віншуем!

ЗОРКА

Музыка з кайфам

Генік Лёска: „American dream" па-беларуску

http://kultura.dziennik.pl

Хочаш ці не хочаш, але ньюсы з усякага роду тэлешоў, нават калі не маеш тэлевізара ці інтэрнэту, плёткай пранікаюць у нашае жыццё. Калі б не гэта, можа я і не ведала б, што наш, беларускі хлопец зараз становіцца слаўным. Гавару наш, бо ў размове пару гадоў таму назад не адрокся каранёў і цёпла ўспамінае роднае Палессе. Завецца Генадзь Лёска і ў бліжэйшую нядзелю будзе змагацца за вялікі прыз, прызнанне журы і тэлегледачоў у фінале праграмы „X Factor".

Генік жыве ў Польшчы з 1992 года, калі прыехаў сюды зайграць на „Басовішчы" з гуртом „Seven B". І ўжо тут застаўся зарабляць грошы ды шукаць сваёй незалежнасці. Польшча ўсё гэта яму дала, таму ў Беларусь вяртаўся ўжо толькі адведваць сям'ю. Тут абзавёўся сямейкай ды да сёння жыве з вуліцы, дзе безупынна канцэртуе. Трэба аднак прызнаць, што дзякуючы тэлешоў павысіліся ягоныя гаданары, а і альбом яго актуальнага гурту „Gienek Loska Band", калі толькі з'явіцца ў крамах, купяць не дзесяткі ці сотні, але тысячы людзей. Хаця не аднаго з'ядае зайздрасць, што Геніку павязло, варта яму дапамагчы, калі не пасылаючы эсэмэску, дык хаця б перадаючы ўсім навокал інфармацыю, што ў фінале — беларус, Генік Лёска, які патрабуе падтрымкі. Не дарма. Ён падорыць за гэта свае арыгінальныя, цікавыя выкананні, бо гэта сапраўды таленавіты вакаліст.

— Адзінае, чаго баюся, гэта страціць голас, — казаў у апошняй размове для „Зоркі". — Я ўмею толькі спяваць.

Зараз, дзякуючы голасу, параўноўваюць яго да іншага гіганта музыкі родам з Беларусі — Чэслава Немэна, якога песень, дарэчы, надта часта не выконвае, хаця каверы гэта яго спецыяльнасць.

Любіць рок, хард-рок, блюз. Зараз здзяйсняецца яго сон, гэты „american dream" як сказаў адзін з сябраў журы тэлешоў. Хаця можа не сніў пра такую славу і, як сказаў у праграме, сёння ёсць супер, заўтра можа быць зусім па-іншаму, то вядома, што ўжо ананімным у Польшчы не будзе. Польшча стала краем ягонага жыцця. Слава яму проста пісаная.

i_basovka@o2.pl

(З народнага календара)

Абрад пахавання стралы

2 чэрвеня, *Ушэсце* (рухомае свята). У гэты дзень забаранялася працаваць, а абавязкам кожнай гаспадыні было напячы бліноў. Людзі верылі, што такім чынам яны дапамогуць узысці Хрысту на неба (бліны мелі напамінаць анучы: *Трэба Хрысту спячы ануч, каб было чым абувацца. Абуецца Хрыстосік і пойдзе ўжо на неба!*). Пасля Ушэсця дзяўчаты пераставалі спяваць вяснянкі. На Гомельшчыне ў гэты дзень ладзілі абрад пахавання стралы. Павадзіўшы карагоды, дзяўчаты і сталыя жанчыны браліся за рукі і доўгім шнурком з песняй цягнулі за сяло ў жыта. Там яны разыходзіліся і кожная закопвала ў зямлі якуюсь рэч: пярсцёнак, пацерку, касняк. Часта іх следам беглі хлопцы і шукалі закапаныя рэчы.

Паміж ***Ушэсцем і Сёмухай*** нельга было снаваць кросны, забаранялася таксама ткаць. Каб не зааснаваць (спыніць), неабходныя ў гэты час дажджы.

Пажарныя сабакі

Бывае часта, што ў гарадах на пажарах застаюцца дзеці ў дамах і іх нельга выцягнуць, бо яны ад спалоху схаваюцца і маўчаць, а праз дым іх нельга ўбачыць. Для гэтага ў Лондане прывучаны сабакі. Сабакі гэтыя жывуць з пажарнымі, і калі загарыцца дом, дык пажарныя пасылаюць сабак выцягваць дзяцей. Адзін такі сабака ў Лондане выратаваў дванаццаць дзяцей: яго клікалі Боб.

Аднаго разу загарэўся дом. І калі пажарныя пад'ехалі да яго, ім насустрач выбегла жанчына. Яна плакала і гаварыла, што ў доме засталася двухгадовая дзяўчынка. Пажарныя паслалі Боба. Боб пабег па ўсходках і схаваўся ў дыме. Праз пяць хвілін ён выбег з дома і ў зубах за сукенку нёс дзяўчынку. Маці кінулася да дачкі і плакала ад радасці, што дачка была жывая. Пажарныя ласкава гладзілі сабаку і аглядалі яго, ці не абгарэў ён, але Боб ірваўся зноў у дом. Пажарныя падумалі, што ў доме яшчэ ёсць што-небудзь жывое, і пусцілі яго. Сабака пабег у дом і хутка выбег з нечым у зубах. Калі народ разгледзеў тое, што ён нёс, дык усе рассмяяліся: ён нёс вялікую ляльку.

Леў ТАЛСТОЙ

Польска-беларуская крыжаванка № 23

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 19:

Сок, порт, жаба, нюх, куст, вяселле, матылёк, дар, ада, як, травень. Сонца, вада, мята, мак, сыр, бусел, пас, лёс, толк, Ян, торт, конь.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Габрыель Кузьмін, Эльвіра Андрусевіч, Дамініка Юрковіч, Юліта Данільчук, Паўліна Паплаўская, Наталля Тамчук, Кацярына Дзержаноўская, Юстына Якубюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

МЕНШАСЦІ — „АБ” ІХ, ЦІ „ДЛЯ” ІХ?

— Лічбавая рэвалюцыя дазволіць на тое, каб на працягу паўтара-двух гадоў павялічыўся абсяг вяшчання рэгіянальнага тэлебачання. З наступнага года пачнецца адыход ад традыцыйнага фінансавання рэгіянальных аддзелаў. Грошы з абанемента будуць перадавацца на канкрэтныя праграмы. Прывілеямі будуць карыстацца таксама меншасныя праграмы, — гаварыў у Беластоку ў час канферэнцыі „Місія публічнага тэлебачання ў шматкультурным грамадстве” старшыня Краёвай рады радыёвяшчання і тэлебачання (КРРіТ) Ян Дворак.

Канферэнцыю сарганізавалі супольна Праграмная рада Тэлебачання Беласток і яго дырэкцыя. Як успамінаў старшыня Праграмнай рады ТБ Адам Дэмбскі, Беласток з’яўляецца найлепшым месцам для такой дэбаты, паколькі тут узнікае найбольш праграм для меншасцей. Рэалізуюцца тут перадачы для беларусаў, літоўцаў, украінцаў, расіян, ромаў і татараў ды праграма для вернікаў праваслаўя. Дарэчы, гадамі таму, калі вялася дыскусія, дзе мае ўзнікнуць дванаццаты аддзел Польскага тэлебачання, якраз аргумент шматнацыянальнасці падляшскага рэгіёна перамог у тым, што стварылі яго якраз у Беластоку, а не ў Ольштыне. Цяпер штомесяц беластоцкае тэлебачанне выпускае ў сярэднім пяць з паловай гадзін праграм, прысвечаных нацыянальным і этнічным меншасцям. У тутэйшым тэлеэфіры можна яшчэ пабачыць справаздачы з культурных падзей такіх як Фестываль музыкі маладой Беларусі „Басовішча” ці Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі (сёлета з-за фінансавых прычын такой абшырнай як у мінулыя гады справаздачы з гэтай імпрэзы ў агульнапольскім тэлеэфіры не было).

Пачынаючы канферэнцыю, **Адам Дэмбскі** адзначыў:

— Справядліва было б, каб новыя задачы, якія стаяць перад рэгіянальнымі цэнтрамі Польскага тэлебачання, між іншым і беластоцкім, фінансаваліся належным чынам прапарцыянальна да разнароднасці і ліку праграм.

Як кіраўнік Беластоцкага тэлецэнтра Агнешка Рамашэўская, так і сакратар гэтага асяродка Юры Каліна (кіраўнік рэдакцыі меншасных праграм) не скрывалі, што справа ў тым, каб меншасныя праграмы былі вылучаны ў спецыяльнай пульцы ў бюджэце цэнтральнага тэлебачання.

Ян Дворак у сваім выступленні адзначыў:

— Увялі мы ў статуты публічных СМІ, каб трактавалі яны сур’ёзна праграмныя рады. Гэта адзіны сувязны паміж грамадскім светам, палітыкай і светам медыяў.

Праграмныя рады гэта грамадскія арганізацыі, роляй якіх з’яўляецца агучванне грамадскай думкі пры Польскім тэлебачанні, між іншым у яе аддзелах. У цяперашняй беластоцкай радзе засядае пятнаццаць асоб, адабраных выключна па палітычным ключы, хоць ёсць у ёй таксама прадстаўнікі творчых асяроддзяў. Затое няма там цяпер ні аднаго прадстаўніка, вылучанага меншаснымі асяроддзямі рэгіёна.

— Пры фінансавай сціпласці Польскае тэлебачанне ў найбліжэйшыя два гады будзе звяртаць увагу на некалькі праграмных аспектаў, між іншым, на меншасныя праграмы, — абяцаў старшыня Дворак.

Прадбачыў ён, што па ініцыятыве КРРіТ, пры ўдзеле Варшаўскага ўніверсітэта, з восені пачнуцца абучэнні для журналістаў, якія займаюцца меншаснай праблематыкай (і якія галоўным чынам выводзяцца з меншасцей):

— Гаворка таксама пра палякаў, будучых меншасцю за мяжой.

Дадаў прытым:

— Дэмакратычныя каштоўнасці прызнаем усе. Справа ў тым, каб іх як найлепш аплікаваць.

Віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі **Тамаш Сямоняк** (адказны ў гэтым ведамстве за нацыянальныя і этнічныя меншасці) адзначыў:

— Наша падтрымка меншасных мерапрыемстваў у Польскім тэлебачанні немагчымая, таму што надта дарагая. Павінны яны фінансавацца з абанемента.

Пры нагодзе спаслаўся на нацыянальны перапіс:

— Падыход, які ёсць у пытанні м.інш. пра двайную ідэнтыфікацыю — добры і ў духу шматкультурнага грамадства.

Сябра ўправы Польскага тэлебачання **Мар’ян Залеўскі** (ён ва ўправе ад імя ПСЛ) прадбачыў:

— Польскае тэлебачанне, калі гаворка пра ўсю праграму, рэалізуе місію і будзе яе рэалізаваць, незалежна ад фінансавых цяжкасцей. (...) Мультыплексы гэта новая рэчаіснасць. Неўзабаве гэты сам атрымальнік будзе сам сабе ствараць перадачы (...). Нашай будучыняй з’яўляюцца тэматычныя тэлеканалы.

Мацей Тэфэльскі, упаўнаважаны падляшскага ваяводы па справах нацыянальных і этнічных меншасцей, гаварыў аб нацыянальна-этнічнай дыферэнцыяцыі Падляшша, інтэграцыі і дэзінтэграцыі меншасцей і іх медыйным дзеянні. У сваю чаргу віцэ-старшыня сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей **Яўген Чыквін** прыгадаў, што сярод еўрапейскіх кіраўнікоў стаў панаваць скептыцызм наконт мультыкультурнасці:

— Прычынай крызісу мультыкультурнасці з’яўляецца непрыкмячанне духоўнага кампанента паасобных культур. Ідэя бесканфліктнага спайвання народаў у Еўропе падвяла. Стварыўся вакуум, у які хочуць увайсці крайнія асяроддзі: нацыяналістычныя і шавіністычныя. Я перакананы, што ў медыйнай прасторы мусяць быць прысутнымі мультыкультурныя каштоўнасці.

Другую частку канферэнцыі, дыскусійную, пачала яе мадэратарка, дырэктарка Беластоцкага тэлецэнтра **Агнешка Рамашэўская**:

— Вельмі расплыўчаты гэта від ідэнтыфікацыі, калі хтосьці адчувае сябе меншасцю ці з’яўляецца чалавекам пагранічча.

І паставіла пытанне:

— Ці гэта павінны быць праграмы перш за ўсё аб меншасцях, ці для меншасцей? — і, здаецца, спрабавала спровакаваць дыскутантаў: — У праграмах аб меншасцях існуе небяспека размыцця тэмы. Такія праграмы часта сыходзілі ў напрамку фальклорнага прыхарошвання, падфарбоўвання свету. Праграмы выключна для меншасцей спрычыняюцца да гетызацыі. Тут існуе і пагроза маргіналізацыі. Гэтае спіхванне на абочыну заключаецца ў тым, што такія праграмы павінны быць, бо так запісана ў правілах [м.інш. у Законе аб радыёвяшчанні і тэлебачанні ад 1999 г. — М. Х.], і іх робяць абы рабіць, ставяць галачку, нейк іх ствараюць.

Яўген Вапа, старшыня Радыё „Рацыя”, галоўны рэдактар „Нівы”, старшыня Беларускага саюза ў РП наконт пытання Агнешкі Рамашэўскай сцвердзіў адназначна:

— Слова **ці** „для” меншасцей, ці „аб” меншасцях трэба замяніць словам **і**. З гэтага вынікае ўсё, што спалучаецца з паняццем місіі.

Успамінаючы аб стаўлянні галачкі Польскім тэлебачаннем пры меншасных пытаннях, спаслаўся на кур’ёзны выпадак перадачы „Літоўская панарама” (якая рэалізуецца беластоцкім аддзелам па-літоўску). Ад студзеня гэтага года літоўская меншасць, пражываючая перш за ўсё на Сувальшчыне, асабліва ў ваколіцах Пунска і Сейнаў, не можа яе аглядаць — не даходзіць туды сігнал тэлекамунікацыйнай лініі, па якой гэтая праграма перасылаецца.

Яўген Вапа таксама заўважыў:

— Лік рэклам перад і пасля меншасных блокаў у праграме тэлеперадач найбольшы, не лічыўшы часу перад і пасля „Аб’ектыва”. Гэта, па-мойму, паказвае на маштаб папулярнасці гэтых праграм. Не хапае агульнапольскай праграмы для мешнасцей у добрым эфірным часе.

Запрапанаваў ён, каб замест або побач вывучання іспанскай і англійскай моў, тэлебачанне пачало разам з Міністэрствам нацыянальнай адукацыі вяшчанне праграм, у якіх навучалі б моў меншасцей. На яго думку, магло б гэта фінансавацца з грошай МНА і МУСіА:

— Такія мультымедыйныя пакеты былі б прыдатныя ў школах.

Пастулаваў таксама:

— Ёсць у агульнапольскім эфіры перадачы з ромскіх, украінскіх і яўрэйскіх фестываляў. Павінны быць таксама трыцатыры вялікія беларускія імпрэзы.

Агнешка Рамашэўская спыніла яго:

— Мусіць быць таксама попыт, мусяць быць гледачы, якія хацелі б гэта глядзець. Мусяць быць яны адукаваныя.

Усе апошнія дыскутанты падтакнулі сцвярджэнню Яўгена Вапы, што мусяць быць заадно праграмы „аб”, як і праграмы „для” меншасцей.

Вальдэмар Янда з Кракава, які рэалізаваў калісьці папулярныя праграмы аб меншасцях „У сябе” і „Этнічныя кліматы” (знятыя з тэлеэфіру), сказаў нават напаўжартам:

— Я цешуся, што на гэтай канферэнцыі мы вырашылі ці мыць нам рукі, ці ногі.

Раней аднак **Ізабела Хруслінская**, каардынатарка еўрапейскага праекта „Шматкультурная Еўропа ў СМІ” заявіла:

— Нельга дэфініяваць, як мае выглядаць праграма меншасцей, бо патрабаванні кожнай адрозныя, а ёсць спробы ўкінуць кожную меншасць у адзін кошык (...). Большасны глядач мусіць ведаць тое, што меншасці маюць права на сваю гістарычную памяць.

Юры Каліна:

— З місіяй датычнай рэалізацыі праграм для меншасцей наш аддзел спраўляецца добра. Адчуваю, аднак, недахоп, калі гаворка пра праграмы аб меншасцях. Гэта вынікае з фінансавай мізэрнасці. У сваю чаргу наш творчы патэнцыял недастакова выкарыстоўваецца ў агульнапольскім эфіры.

Агнешка Рамашэўская:

— Я звяртаю ўвагу на тое, каб не ствараць гетаў. Матэрыялы, звязаныя з меншасцямі, стараемся рабіць таксама для іншых перадач, напрыклад, для „Аб’ектыва”.

Ева Штольц, старшыня прадзюсерскай управы „Про-Футура”, якая рэалізуе радыё- і тэлепраграмы нямецкай меншасці:

— Усё залежыць ад таго, якое стаўленне да меншасці ва ўправе тэлебачання.

Пятро Тыма, старшыня Саюза ўкраінцаў у Польшчы:

— Праблема гетызацыі адносіцца да таго, што думае большасць аб меншасці. Фальклор дапускаецца, але крананне грамадскага зместу — ужо не. Калі гаварыць аб праграмах аб меншасцях, маем дачыненне з катастрофай. Яны заганяюцца ў гета!

Лешак Шмітке, прадстаўнік кашубаў на Радыё Гданьск (у кашубаў ёсць камерцыйныя радыё і тэлебачанне):

— Форма меншасных праграм вельмі важная. Гэта не можа быць кола ўзаемахвальбы. Мусяць яны прыстойна прамавацца. Хваробай публічных СМІ з’яўляецца іх палітызаванасць. Алічбоўка дазволіць стварыць меншасныя каналы.

Агнешка Рамашэўская:

— Чым далей трымаецца палітыка ад праблем меншасцей, тым лепш.

Лешак Шмітке:

— Публічныя СМІ з’яўляюцца толькі часткай праблем у будаванні патрыятызму і тоеснасці ў шматкультурным грамадстве.

У дыскусіі не ўдзельнічалі ані Ян Дворак, ані Тамаш Сямоняк (у іх былі іншыя абавязкі). Дыскусію пакінуў таксама Мар’ян Залеўскі.

Ізабела Хруслінская:

— Ад пана Мар’яна Залеўскага я не пачула ніякага адказу ні на адно з пытанняў. На працягу каля дзесяці мінут яго выказванні прагучалі толькі агульныя фразы. Гэтая тэндэнцыя прыкмячаецца ад гадоў.

Ева Штольц:

— Не хапіла тут дыялогу, хоць сустрэча была ўжо чарговая. Адчуваўся ў зале недахоп другога боку. Пераконваем перакананых.

Лешак Шмітке:

— Сплылі асобы, якія павінны пачуць тое, што мы гаворым. Сказалі яны, што мелі сказаць, ды ўжо не хацелі пачуць таго, што сказаць мелі іншыя.

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Падарожжа з гісторыяй

Выходжу з поезда на станцыі Сычы і перад маімі вачамі паказваюцца пара каляровых крыжоў: жоўты заходні і сіні — усходні. Пазней, на схіле манастырскай гары ў Грабарцы пабачу чарговыя каляровыя крыжы — відаць цяпер настае такая мода. Можа колеры маюць нейкія малітоўныя асэнсаванні і зручней імі карыстацца, чым нейкімі алфавітамі са складанымі правіламі правапісу.

Перасякаю вуліцу ў Сычах і маю ўвагу прыцягвае драўляная паветка накшталт паветак на аўтобусных прыпынках. Але меткі прыпынка там няма. З другога боку шашы двух мужчын гародзіць плот, пытаю аднаго з іх пра цікавы мне аб'ект. І даведваюся, што пабудаваў яго тамашні жыхар Міраслаў Сычэвіч для малых дзетак, якія там чакаюць школьнага аўтобуса, бо гміна ў Нурцы-Станцыі неяк не ў змозе гэтага зрабіць. Паветка арыгінальнага дызайну, якая не толькі прыхавае дзетак ад непагадзі, але і разбудзіць у іх пачуццё эстэтыкі. Калі пытаю пра адрас таго добрага будаўніка, мой інфарматар крышку бянтэжыцца, што мо нагаварыў мне замнога, але ўсё ж такі дае мне гэтую інфармацыю, з заўвагай, што, магчыма, ён будзе дома.

Аднак у будаўніка паветкі нікога дома не было, а калі я адышоў ад замкнутых дзвярэй, падняўся невялікі сабака і на сваёй мове выказаў магчымую прэтэнзію, што я праігнараваў ягоную прысутнасць на панадворку; далучыліся да яго і суседскія сабакі...

Вяртаючыся да шашы ў бок Грабаркі заглянуў я яшчэ і на панадворак каля мураванкі з салтысоўскай шыльдай. Побач дома былі прыгнечаныя гадамі солтысавы бацькі, якія паінфармавалі мяне, што сына дома няма, а пра вёску магу даведацца ў ягонай жонкі, якая працуе прадавачкай у мясцовай краме. А ў той краме, што пасярэдзіне вёскі, я ўжо ўспеў пабываць і вяртацца мне не захацелася. Даведаўся я адно толькі ў старажылаў, што ў Сычах трох гаспадароў займаецца вытворчасцю малака, якое здаюць у Сямятычы. Больш я не смеў распытваць, бо ж людзям, за якімі багатыя дзесяткі юбілеяў, і без мяне цяжка.

За Сычамі, на першым павароце асфальтоўкі, я павярнуў у лясную сцяжынку, якая зараз вывела мяне на лясную дарожку ў бок санктуарыя. Яна цяпер менш наезджаная і находжаная чым нейкі дзесятак гадоў таму. Людзі з паяздоў пераселі ў аўтобусы і легкавушкі і па той дарозе са станцыі на Гару няма ўжо вельмі і каму хадзіць. У адным месцы дзікі пакінулі разлеглыя сляды сваіх пошукаў. А калісь, бадай у 1950-х гадах, гэтая лясная дарожка несла цяжкую ношу паломнікаў і брат маёй бабулі, каб сесці на поезд у напрамку Гайнаўкі, хітранька ехаў спярша ў Сямятычы і там перасядаў на поезд у адваротным напрамку; у Сычах не ўсім пасажырам на ўсход удавалася тады ўлезці ў вагоны...

Гара на Грабарцы сваю славу распачала тры стагоддзі таму. Але яе гісторыя, гэта свайго роду паэзія. Каб паказаць гэта, пакарыстаюся артыкулам беластоцкага гісторыка, прафесара Юзафа Марошка з 13-га нумара часопіса «Gryfita» з 1997 года. На сам пачатак аўтар піша: «Grabarka jest dziś dla prawosławnych tym, czym Jasna Góra dla katolików. Wydawałoby się, że historycy Cerkwi prawosławnej uczynili niemal wszystko dla wyjaśnienia przeszłości sanktuarium, a temat ten w całości poznany jest przez badaczy. Tymczasem archiwa krajowe i zagraniczne wciąż kryją nieznane dotąd źródła historyczne, w świetle których zmianie ulec musi pogląd na przeszłość tego miejsca». Паэзію апошняга сказа, мяркую, відаць як на далоні.

Hej, Sokoły! Na zielonej Чкраіне наведвайце Уеркаси, Уернівці та Уернігів!

Геаграфічны даведнік з 1900 года пісаў так: «Pośród lasu, na niewielkim wzgórku, wznosi się mała cerkiewka, filija siemiatyckiej. Miejsce to przez lud uważane jest za cudowne. Cerkiewka została zbudowana na pamiątkę, że mieszkańcy Siemiatycz, podczas powietrza morowego r. 1710, szukali tu schronienia».

Згаданыя раней праваслаўныя гісторыкі мяркуюць, што на Грабарцы шукалі раней сховішча і праваслаўныя манахі, спярша хаваючыся ад татарскіх нашэльцаў хана Батыя, а пазней перад пераследам з боку ўніяцкіх неафітаў і іх каталіцкіх паплечнікаў. Але прафесар Марошэк рашуча абвяргае гэтае меркаванне: «To nie mnisi prawosławni byli twórcami ośrodka kultowego na Świętej Górze Grabarce. Dokonał tego unicki metropolita całej Rusi, opat supraski, wielki reformator Kościoła Unickiego w Rzeczypospolitej, organizator Synodu Zamojskiego Leon Kiszka. To on 1 lipca 1717 r. wyraził zgodę na odprawianie w kaplicy na Świętej Górze Grabarce nabożeństw unickich». А якія ж набажэнствы адпраўляліся ў капліцы да таго часу? Далей: «Dokonał tego w kilka miesięcy po tym, jak 1 lutego 1717 r. na sejmie «niemym» car Piotr I, prześladowca unitów i morderca bazylianów połockich stając się gwarantem praw w Rzeczypospolitej «zawisł czarną chmurą» nad Kościołem Unickim w Polsce. To mogło decydować o wezwaniu kaplicy i katolickim odpuście na święto Przemienienia Pańskiego. Proszono Boga nie tylko o zdrowie dla ludzi, ale i o ocalenie dla ojczyzny, prosząc by mogli zachować wobec rosyjskiej przewagi swą katolicką, unicką wiarę». Мабыць, гэтыя апошнія просьбы і запісаны ў «nieznane dotąd źródła historyczne, w świetle których zmianie ulec musi pogląd na przeszłość tego miejsca».

Пан Марошэк піша далей: «(...) dzieje miejsca kultowego na Świętej Górze Grabarce wskazują, że ten katolicki ośrodek trudno był «przyswajalny» przez Kościół prawosławny po 1839 r.». І як ілюстрацыю свайго сцвярджэння прыводзіць апісанне царквы з 1866 года: «Cerkiew drewniana, bardzo uboga, ale sławna ze swej wiekowości i cudownych uzdrowień od różnych niemocy dla tych, kto przybywa z wiarą w to święte miejsce. Ściany tej świątyni prawosławia mocne, ale dachu prawie nie było. W 1857 roku w wyniku starań siemiatyckiego duchownego została ona pokryta słomą. Podłogi w niej zupełnie nie ma, zostały się jedynie legary, na których kiedyś znajdowała się podłoga. Ikonostas składa się tylko z czterech starych, niedużych ikon, malarstwa rusko-bizantyjskiego, które nierzadko spotykamy w starych cerkwiach naszego Kijowa i Nowogrodu. Ołtarz — prosty stolik, przykryty białym płótnem, oczywiście podczas nabożeństw. Wewnątrz tej cerkwi nie ma żadnego wyposażenia, nawet nie ma sufitu (...). Tu 6 sierpnia w Dzień Przemienienia Pańskiego spływa kilka tysięcy osłabionych, cierpiących i zdrowych, nie tylko prawosławnych, również katolików (kto przybywa z prawdziwą pełną wiarą) zostaje uzdrowionych. Jest to miejsce święte (...). Tysiące wiernych wokół świątyni, ale bez szumu, krzyku (...). Wokół cerkwi prawosławne duchowieństwo z okolicznych parafii (z powodu ciasnoty) wielką czcią i strachem Bożym służy molebny, akatysty o zdrowie żywych i pokój dusz zmarłych. W samej cerkwi liturgia trwa od godz. 10 do 13. Echo daleko roznosi po lesie cerkiewne śpiewy. Prawie niemożliwe staje się przedostanie do wnętrza cerkwi. Lepiej przyjść wcześniej by zająć miejsce».

Крыж на раздарожжы перад Радзілаўкай

І сёння, у юльянскі шосты дзень жніўня збіраюцца вакол царкоўкі непасільныя для храмавай ёмістасці тысячы вернікаў. Гэта дзеля іх на той дзень перад храмам пабудаваны палявы алтар, дзе адбываецца служба. Той алтар нагадвае мне алтары, якія ставіліся ў нас для папскіх пілігрымак. І гэта таксама павінна падмацоўваць тэзісы прафесара Марошка пра каталіцкія карані нашага санктуарыя...

У манастырскіх мурах у сённяшні будзённы дзень пуста — акрамя мяне вакол царкоўкі яшчэ пяць асоб з прафесійнымі фотаапаратамі. На дзвярах храма інфармацыя, што царкву адкрываюць для наведвальнікаў з дзесятай гадзіны. Але ніхто з манашак у той час не паказваецца. Абыходжу царкоўку, прыглядаюся рознамаштабным крыжам. Пасля пятнаццаці хвілін пасля названай дзесятай гадзіны падаюся шукаць нейкую матушку. Удаецца мне пабачыць маладзенькую паслушніцу, якая выйшла паліваць кветкі. Каб не заклапочваць яе, ужо не пытаю пра магчымасць зайсці ў царкоўку, адно пытаю пра дарогу ў бок Мельніка і Радзілаўкі. Сястрычка папольску раіць мне падацца ў Шумілаўку і адтуль у патрэбным мне напрамку.

На мой нюх гэта не тая дарога і выбіраю асфальтоўку, што з поўдня прыліпла да манастырскіх муроў. Неўзабаве насціл дарогі мяняецца на жвіровы, дарога ўвесь час вядзе цераз малады, пераважна сасновы, лес. І калі ўжо пачынаю непакоіцца, ці не памыліўся я, не слухаючы настаўлення маладой манашкі, на лясным раздарожжы паказваецца крыж, пастаўлены жыхарамі Радзілаўкі. Але гэтая вёска, якая так называлася калісь, напрыклад у 1662 годзе, калі насяляла яе каля васьмідзесяці жыхароў, цяпер называецца Радзівілаўкай. Калі пасля далейшых некалькіх кіламетраў заходжу ў вёску, магу канстатаваць, што цяперашняя назва больш правільная. Хаты тут рупліва дагледжаныя, паўсюдна чуваць галасы вольных птушак і водар як подых раю. Адчуваецца прысутнасць людзей, але і іх прыхаванасць, быццам за нейкімі замкавымі мурамі, быццам жывуць яны так, як калісь жылі самі Радзівілы...

У Мельніку чарговы подых мясцовай паэзіі. На аўтобусным прыпынку расклад аўтобусаў, на якім няма курсаў у Сямятычы, спісаных мною з інтэрнэту, у тым ліку і прадбачанага на гадзіну 12.45. Яшчэ дзесяць хвілін да гэтага на прыпынку пуста, але неўзабаве з'яўляюцца чатыры асобы, па якіх відаць волю ад'езду. І сапраўды, у 12.45 на прыпынак пад'язджае непрадбачаная ў раскладзе машына. І той расклад зноў нагадвае мне «nieznane dotąd źródła historyczne, w świetle których zmianie ulec musi pogląd na...». Рышард Купусцінскі быў калісь напісаў кніжку «Podróże z Herodotem». А ў мяне атрымалася падарожжа з прафесарам Марошкам.

СВОЙ ПІСЬМЕННІК

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У нядоўгай гісторыі Гайнаўкі былі творчыя асобы, якія пісалі прозай або займаліся паэзіяй. Аднак асобай, якую ў Гайнаўцы сталі называць сваім пісьменнікам, з'яўляецца Міхал Андрасюк, які піша на беларускай і польскай мовах. У сваіх творах аўтар адклікаецца перш за ўсё да менталітэту жыхароў прыпушчанскага горада і яго своеасаблівага каларыту, а не да адметнасцей Беластока, Бельска-Падляшскага, ці роднай Войнаўкі (гміна Дубічы-Царкоўныя). Менавіта другім, па часе пражывання, а ў іерархіі вартасцей пісьменніка можа і першым, з'яўляецца Войнаўка, дзе Андрасюк правёў дзяцінства, маладосць, дзе ў сваёй майстэрні выконваў намагільныя помнікі, а ў непадалёк распаложанай Палічнай працаваў настаўнікам. Апошнім часам у Войнаўцы ён адпачывае і піша. Працуючы на Радыё „Рацыя", Міхась многа часу прабываў у Беластоку, а на практыцы і жыў там. Магчыма, што ў ваяводскім горадзе пражывае найбольш чытачоў яго кніжак. Літаратурнае асяроддзе вельмі цёпла ўспрымае творчасць Міхала, але складваецца ўражанне, што пісьменнік не так моцна зжыты з Беластокам, што яго перш за ўсё цягне ў родную вёску, на свой панадворак, абсаджаны дрэвамі розных парод. Гэта адчувалася таксама ў час сустрэчы з Міхалам Андрасюком, наладжанай 13 мая ў Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы. Прамоцыя апошняй польскамоўнай кніжкі „Вагон другога класа" адбылася ў Гайнаўцы восенню мінулага года ў Музеі і асяродку беларускай культуры і таму на гэты раз арганізатары спаткання хацелі паразмаўляць аб жыцці і ўсёй творчасці празаіка, аб чым заявілі ў пачатку спаткання. Аднак у гарадскую бібліятэку прыйшлі перш за ўсё асобы, якія прачыталі апошняе польскамоўнае выданне і таму ў час дыскусіі госць найчасцей адказваў на пытанні наконт „Вагона другога класа".

— Мы павінны ганарыцца тым, што жыве сярод нас і піша пра нас, пра Гайнаўку і наваколле, такі чалавек як Міхал Андрасюк. Чэрпае ён матывы для сваёй творчасці з нас, з людзей, з якімі пазнаёміўся, — заявіла дырэктар Гарадской бібліятэкі Галіна Вайсковіч. — Можам ужо гаварыць аматаль аб дзесяцігоддзі творчай дарогі Міхала Андрасюка, якога „Вагон другога класа", побач твораў вельмі прызнаных пісьменнікаў, цяпер намінаваны да Літаратурнай прэміі Цэнтральнай Еўропы „Ангелюс".

Дырэктар Галіна Вайсковіч коратка расказала аб пісьменніку і яго літаратурных здабытках (між іншым быў узнагароджаны часопісам „Дзеяслоў" прэміяй „Залаты апостраф — 2009" і быў фіналістам прэміі імя Веслава Казанэцкага), прыгадваючы таксама загалоўкі выдадзеных кніжак — „Фірма", „Мясцовая гравітацыя", „Белы конь", „Вуліца добрай надзеі" і „Вагон другога класа".

— Мая любоў да чытання кніжак паявілася ўжо ў дзяцінстве, калі я стаў таксама марыць, каб стаць пісьменнікам і напісаць дзесяць кніжак. Я тады нават прыдумваў загалоўкі для гэтых кніжак. Калі бацька не даваў мне многа чытаць, я чытаў ноччу, — гаварыў Міхал Андрасюк. — У маладосці я крыху займаўся паэзіяй і пісаў вершыкі. Аднак шостая мая кніжка, у якой сябры сабралі і надрукавалі мае вершы, ёсць як няшлюбнае дзіця і я не лічу яе важнай у маёй творчасці.

— Чаму Вы рашыліся напісаць кніжку на польскай мове, калі раней пісалі па-беларуску? — пыталі гайнавяне.

— Я пісаў па-беларуску. Зараз складана адказаць, чаму рашыўся пісаць на польскай мове. Можа хацеў праверыць свае сілы, зрабіць нешта новае, а можа каб дайсці да іншага чытача і зацікавіць людзей у Польшчы? — гаварыў Міхал Андрасюк. — Я хіба адзіны беларускі пісьменнік, які перш за ўсё апісвае горад. Я звяртаю асаблівую ўвагу на псіхалогію герояў. У сваіх творах я ніколі не з'яўляюся адным з іх. Бяру герояў з жыцця, хаця некаторыя з іх агульныя. Мне важныя людзі з Гайнаўкі, бо яны ствараюць горад, а не гісторыя будынкаў ці месцаў.

Сабраныя ў бібліятэцы гайнавяне захапляліся прыгажосцю слова ў творчасці Андрасюка. Пыталі, як так цудоўна можа пісаць на польскай мове пісьменнік, які раней пісаў па-беларуску.

— Кніжка „Вагон другога класа" практычна не была рэдагаваная, былі папраўлены ў ёй толькі паасобныя стылістычныя нязручнасці, — сказаў на спатканні Марцін Рэмбач, старшыня Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь, выдавец апошняй кніжкі Андрасюка. — Я перад выданнем гэтай кніжкі хацеў паправіць толькі пунктуацыю, але Міхась апасаўся выдаваць на польскай мове без рэцэнзіі спецыялістаў па польскай літаратуры. Спачатку кніжку стаў правяраць адзін з прафесараў, але адмовіўся працаваць далей і сказаў, што кніжка так добра напісана, што не трэба рабіць у ёй паправак. Яўген Кабац на кніжку „Вагон другога класа" напісаў вельмі добрую рэцэнзію.

— Я пісаў раней па-беларуску і апасаўся выдаваць кніжку на польскай мове. Але добрая рэцэнзія Яўгена Кабаца пераканала мяне. Мая родная мова — беларуская і я нават першы раздзел кніжкі „Вагон другога класа" напісаў на беларускай мове. Аднак пасля ад пачатку стаў пісаць яе па-польску, бо не ўмею перакладаць сваёй творчасці. У мяне ёсць таксама ціхая надзея яшчэ ў гэтым годзе выдаць кніжку „Жубрэрас", аб пачуццях у маламестачковым жыцці, — расказваў Міхал Андрасюк.

Марцін Рэмбач паведаміў, што яшчэ ў гэтым годзе прадбачваецца выдаць пераклад кніжкі „Белы конь" на польскую мову.



Адметнасць кожнага віду мастацтва ў тым, што яно — вынік адлюстравання не толькі рэчаіснасці, але і погляду мастака на гэтую рэчаіснасць. Вока і слых мастака мусіць заўважыць тое, што не заўважаюць звычайныя людзі, хаця бачаць і чуюць тое штодня. Разнастайныя напрамкі ў мастацтве гавораць аб разнастайным успрыняцці навакольнага цэлымі коламі і слаямі грамадства. Таму штосьці для аднаго чалавека зразумела і відавочна, а для другога — бессэнсоўна і абстрактна.

Праўда, у свеце існуюць мастакі, якія здольныя рабіць свае творы адначасова і зразумелымі, і загадкавымі. Адзін з іх — Мікалай Чысцякоў, сайт якога месціцца па адрасе http://be.nicholaschistiakov.com.

Сайт мастака зусім непадобны на іншыя. Па-першае, тут неверагодная колькасць моўных версій, па-другое — няма звыклага дзялення на дзве ці тры часткі, па-трэцяе — выйсці да большасці твораў пазначаны малымі квадратамі ў шахматным парадку і займаюць большую частку выяўлення на галоўнай старонцы. Такая будова сайта адразу ўказвае, што ягоны ўладальнік гэта чалавек неардынарны і, хутчэй за ўсё, цікавы.

Гэта лёгка пацвярджаецца біяграфічным тэкстам, што месціцца на адпаведнай старонцы. Адтуль мы даведаемся, што Мікалай Чысцякоў — гэта 30-гадовы беларускі амерыканец. Калісьці ён жыў у Беларусі, але потым падаўся ў Новы Свет. „У сярэдзіне 2000-х гадоў Чысцякоў пераязджае ў Злучаныя Штаты. Некалькі гадоў у Нью-Йорку мастак працаваў на будаўніцтве, займаўся дэкарацыяй і рэкламай. Амерыка прадстаўлялася абсалютна апазітным мірам у параўнанні з крыху ізаляванай постканструктывістычнай Беларуссю. Новае мастацтва Чысцякоў стварыў пад уражаннем кантрастаў жыцця ўльтрасучаснага Нью-Йорка ды ізаляваных італьянскіх ускраін. Таксама, на мастака паўплывала творчасць прыкметных заходніх мастакоў Герхарда Рыхтэра і Эрыка Фішла. У 2005 годзе мастак наведвае Германію. Падзея значна паўплывала на ўсю тэматыку творчасці. Спадчына тысячагадовай Еўропы значна змяніла ягоную творчасць. У 2007 годзе ў Нью-Йорку адбылася дэбютная персанальная выстава мастака: *Час і Вымярэньні*", — распавядаецца ў „Біяграфіі".

Такі шырокі ў геаграфічным сэнсе погляд мастака і адбіўся на яго творах. Для таго, каб іх зразумець, мала толькі паглядзець. Верагодней за ўсё, трэба яшчэ, па меншай меры, пажыць там, дзе жыў ці жыве мастак. А гэта, прынамсі, Беларусь і ЗША. Тады мы і ўбачым сэнс у такіх інтрыгуючых яго творах як „Паўдзённы суіцыд" альбо скульптура „1000 гадоў".

У той жа час, нягледзячы на рызыку быць цалкам незразумелым суайчыннікамі, Мікалай Чысцякоў — прызнаны творца. „Творы мастака былі ўключаны ў шэраг міжнародных выстаў. Прадстаўлены ў прыватных калекцыях у Нью-Йорку (ЗША), Маскве (Расія), Мінску (Беларусь), Стакгольме (Швецыя), Вялікабрытаніі", — распавядаецца ў ягонай біяграфіі.

Усе выявы твораў Чысцякова, якія змешчаны на сайце, стаяць у нейкім парадку. Мастак падзяліў іх на фатаграфію, відэа, малюнак, жывапіс і скульптуру. Усе гэтыя віды мастацтва падуладныя Мікалаю Чысцякову. Спасылкі ж на лепшыя творы месцяцца на галоўнай старонцы.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ

Музей у Гудзевічах

У маім гардэробе захоўваецца толькі адна каштоўная рэч. Гэта тканы ў нацыянальных колерах імянны гальштук, атрыманы некалі ў Гудзевічах пад адзін з дзён нараджэння. Атрыманы з рук Алеся Мікалаевіча Белакоза і тым дарагі асабліва. Мяркую, што тыя, хто маюць такі гальштук, адчуваюць нешта падобнае. Майстэрства ткацтва, дарэчы, адрадзіла пры мясцовым музеі жонка Белакоза — спадарыня Вера.

Гудзевічы зрабіў знакамітымі адзін чалавек — Алесь Белакоз, хоць гэтая вёска ў сучасным Мастоўскім раёне мае ў сваёй гісторыі цэлы шэраг іншых цікавых людзей. Музей літаратурнага краязнаўства заснаваны быў Белакозам у 1965 годзе. Менавіта тут паўстаў першы стэнд, прысвечаны вялікай паэтцы Ларысе Геніюш. Яна вучылася ў Гудзевічах у пачатковай школе ў 1919-1920 гадах. Пра тое, як збіраліся экспанаты, ходзяць цэлыя легенды. Гэтыя легенды — абсалютная праўда і яе даведацца можна ад самога Белакоза. На якія дыпламатычныя хітрыкі і дасціпныя камбінацыі ён не ішоў, каб здабыць тую ці іншую рэч, якая пазней займала належнае месца ў экспазіцыі і ашчадна зберагалася. Тут можна ўбачыць старажытны човен, знойдзены і адкапаны на Нёмане, багатую калекцыю мінералаў, лісты і кнігі, падпісаныя класікамі беларускай літаратуры, унікальную калекцыю падвойных дываноў, адзіны ў свеце глобус па-беларуску, вырабы мясцовых кавалёў, збор народнага адзення, іншыя каштоўнасці. Гудзеўскі (на варыянце Гудзеўскі, а не Гудзевіцкі, настойвае менавіта сам Белакоз) музей — сапраўдны асяродак беларускай тоеснасці, адлюстравання нашага мінулага. Белакоз, які пачынаў у юнацтве як радыкальны маладзён, пазней абраў іншы кірунак дзейнасці і праз сваю далейшую музейную справу зрабіў уплыў на тысячы беларусаў, знайшоў культурны ключ, дзейсны шлях адбітку на свядомасці тых, хто ад вякоў імкнуўся „людзьмі звацца", але так і не даспеў да належнай грамадска-нацыянальнай супольнасці. Музей рос, шырыўся і прырастаў новымі экспанатамі. Створаны на грамадскіх пачатках пры школе, ён у 1990 годзе на золку суверэнітэту атрымаў статус дзяржаўнага. І атрымаў гэты знак якасці абсалютна заслужана за сваю адметнасць і зборы — агульная плошча экспазіцыі складае больш 700 квадратных метраў, а зберагаецца ў гэтым асяродку больш чым 12 тысяч экспанатаў.

Музей, які стварыў Белакоз, не пакідаў абыякавым нікога, як і сам яго дырэктар. Калі хто прыязджаў у Гудзевічы і казаў, што мае толькі паўгадзіны, Белакоз адразу наўпрост казаў: „Да пабачэння!". Звычайныя яго экскурсіі доўжыліся тры-чатыры гадзіны — і гэты час пралятаў незаўважна для шматлікіх наведнікаў.

Музей і яго стваральнік зазналі нямала перашкод і выпрабаванняў. Людзі ў плашчах „кофейного цвета", як іх называе сам спадар Алесь, праводзілі ўсялякія „прафілактычныя" гутаркі, сачылі за тэматыкай экспазіцыі і за самім дырэктарам. Але нават у савецкі час ніхто не дадумаўся спыняць аўтобусы, якія выехалі на экскурсію ў Гудзевічы. У найноўшы час такое здарылася, што яшчэ раз падкрэслівае значнасць музея і яго стваральніка для нацыянальнага адраджэння. Урэшце пенсіянера Белакоза цынічна спіхнулі з пасады дырэктара, але ён дагэтуль працягвае свае незабыўныя экскурсіі. Музей у Гудзевічах і Белакоз даўно сталі сінонімамі, альфай і амегай звычайнай па сутнасці вёскі, якая прыдбала вядомасць у агульнабеларускім маштабе. І не хочацца верыць, што калі-небудзь будзе па-іншаму.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Адна біяграфія



Расказвае 86-гадовы Рыгор ЯКАНЧУК з вёскі Райкі Бельскай гміны.

За баявыя заслугі Рыгор Яканчук удастоены шматлікіх медалёў. У мінулым годзе з Масквы атрымаў медаль „65 лет победы в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.”.

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

— Бацька наш, Мікіта Яканчук, выходзіў з вёскі Райкі. У 1914 годзе, будучы падросткам, з сям'ёй падаліся ў бежанства. Апынуліся на Сібіры. Колькі па чужыне яны блукаліся, цяжка сказаць. Дамоў вяртаўся з іншымі бежанцамі адзінокім, бацькі памерлі. У Райках заспеў парослае пустазеллем поле і зруйнаваныя будынкі. Цяжка было аднаму спраўляцца з чатырнаццацігектарнай гаспадаркай. Рашыў ажаніцца. Пасваталі яму Галену з Мокрага. Згулялі вяселле. У іх нарадзілася пяцёра дзетак: Рыгор, Пятро, Іван, Марыя і Вольга. У сям'і я быў самым старэйшым, нарадзіўся ў 1925 годзе.

Да вайны займаліся гаспадаркай. Разам апрацоўвалі поле. Нядрэнна жылося. У Райках лічыліся „багатымі”. Як прыйшлі саветы, прызвалі мяне ў армію. На камісію ў Бельск-Падляшскі прызвалі 21 лістапада 1944 года. З наваколля няшмат было навабранцаў. Памятаю, што яшчэ было трох: Міхал з Падбелля і двух хлопцаў, якіх прозвішчы не запамяталіся. З Бельска павезлі нас на варшаўскі фронт. Прызначылі мяне кулямётчыкам у 5 Арлоўскую дывізію пяхоты I Беларускага фронту. Пад Варшавай заставаліся да студзеня 1945 года. Затым рушылі на Берлін.

Немцы адступалі. Савецкія войскі ішлі наперад. Праходзілі жорсткія баі, бо праціўнік ставіў моцнае супраціўленне. У населеных пунктах змаганні праходзілі за кожны дом, за кожную вуліцу. Гітлераўцы не змаглі стрымаць наступлення рускіх. Паў Берлін. Наша дывізія прасоўвалася ў глыб Трэцяга Рэйха. Дайшлі да горада Гентын на Эльбе. Там сустрэліся з амерыканцамі. Немцы капітулявалі. Было гэта недзе каля 5-9 мая 1945 года.

Чатыры дні дазвалялася праходзіць праз мост да амерыкаскіх салдат. Пасля забаранілі. Саюзнікі паставілі на мосце ахову. Але не стрымала гэта смельчакоў. Перабіраліся праз раку ўплаў. На канец амерыканцы паставілі прыбярэжную ахову...

Над Эльбай стаялі да жніўня. Адтуль перамясцілі нас на маньчжурскі фронт. Паколькі не ведалі месца назначэння, заставаліся ў вагонах. Але і тут вайна закончылася. Тады павезлі ў Беларусь. Разгрузіліся ў Паставах Віцебскай вобласці. Размеркавалі нас паводле гадоў нараджэння, затым перамяшчалі з горада ў горад: Магілёў, Бабруйск, Гомель... Дэмабілізавалі на станцыі Злынка. Было гэта на Сёмуху 1948 года. У час дэмабілізацыі заявілі, што можам падавацца на жыхарства ў любое заселенае месца, апрача Масквы і Ленінграда, паколькі там складанасці з прапіскай. Падаўся я ў Барыслаў. Аформіўся на шахту «Укрозокерит». Працаваў шахцёрам. Неўзабаве пазнаёміўся з палячкай, Станіславай. Стася выходзіла з вёскі Хадаркоў Корнінскага раёна Жытомірскай вобласці. Сяло вялікае, быццам палова Бельска-Падляшскага. У тым жа годзе пажаніліся. Жонка ў Барыславе працавала лабаранткай. Год пазней нарадзіўся сын Віктар, а ў 1951 г. — Толік. Неўзабаве перамесціліся мы на Закарпацце. Нейкі прадстаўнік з Масквы звербаваў нас на працу ў гідраэлектрастанцыі. Пасяліліся ў мясцовасці Вільшаны непадалёк горада Хуст. Працаваў я там пры пабудове тунэля. Жонка займалася сынамі. Неспрыяльныя ўмовы працы заставілі вяртацца ў Расію. Падаліся на паўночны Каўказ. Аформіўся я на свінцовую шахту. Было гэта, здаецца, у 1952 годзе, перад смерцю Сталіна. Суровы, гарачы клімат адмоўна паўплываў на жончына здароўе. Медычная служба не дазволіла ей працаваць у такіх умовах. Перасяляемся затым у горад Карастышаў Жытомірскай вобласці. Працаваў я ў вугальнай шахце. Там заставаліся да 1958 года. Калі пачалася рэпатрыяцыя, падалі прашэнне на выезд у Польшчу. Заяву адкінулі. Рашыў я паехаць у польскае консульства ў Кіеў. Прыняла Ванда Васілеўская. Выслухаўшы мяне, накіравала ў органы бяспечнасці да начальніка Шкатулы. Намякнула пры тым, каб не выяўляць яе прозвішча.

Дамоў вяртаўся я ў аптымістычным настроі. Сказалі, што праз два тыдні атрымаю адказ. Паведамленне прыслалі праз дзесяць дзён — ставіцца з сям'ёю ў Жытоміры. 10 лютага 1958 года пагрузіліся мы ў брэсцкі цягнік. Адтуль падаліся ў Белую-Падляшскую, дзе знаходзіўся рэпатрыяцыйны пункт. Там назначалі на месца жыхарства па ўсей Польшчы. Мы хацелі вярнуцца на бацькаўшчыну, у Райкі. Паводле атрыманай рэпатрыяцыйнай кніжкі (давала права залічыць стаж працы ў Польшчы) зараз жа ўладкаваўся слесарам на ільназаводзе (г.зв. рашарні) у Бельску. На прадпрыемстве перапрацаваў 27 год і 8 месяцаў — да выхаду на пенсію. Памерла жонка. Застаўся з сынамі. Старэйшы Віктар ажаніўся, абсталяваўся ў Бельску. У іх двое дзетак, хлопец і дзяўчына. Унучак у мінулым годзе ажаніўся. Дачакаўся я праўнука. Гаспадарку перапісаў на сына і ўнука. Старасці дажываю ў Райках з Толікам. Але і Віктар пра нас не забывае. Прыязджае з дзецьмі ды ў сямейным крузе засядаем да застолля. Тады і паўспамінаем пра мінулыя будні і нялёгкую долю.

Запісаў Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка

1. сплаў жалеза з вугляродам, менш коўкі чым сталь, 2. кавалак старой тканіны, 3. тугая павязка для падтрымання сценак жывата або іншых частак цела ў патрэбным становішчы, 4. прылада касца, 5. жыхар Берліна, 6. Паўлюк, аўтар верша „Зайграй, зайграй, хлопча малы...”, 7. большы за асу, 8. стальная зубчатая пласціна для разразання дрэва або металу.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — сенегальская пагаворка.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 18 нумара

Мур, Нява, пава, печ, Сумы, сяўба, туман, чай.

Рашэнне: **Вер пабачанаму, сумнявайся ў пачутым.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яну Міхалюку** з Чыжоў і **Міхалу Байко** з Беластока.

05.06 — 11.06

(22.03. — 20.04.) Першыя дні — нядобры момант пачынаць змаганне за штосьці, што можа не мець рацыі. Не тузайся! Ды не пераймайся дробнымі перашкодамі, якія мо не зруйнуюць табе планаў, ды могуць іх ускладніць. Аднаві старое знаёмства, хоць бы для таго, каб усё растлумачыць.

(21.04. — 21.05.) З 4.06. паявяцца ў цябе магчымасці, якіх у цябе не было ад гадоў! Шмат навучышся і расправіш крылы. Шчасце і дабрабыт. Найцяжэйшыя справы стануць дзяцінна лёгкімі. Цешся і малымі поспехамі, бо за імі прыйдуць сапраўды вялікія. Юпітэр паможа табе здзейсніць не адну мару.

(22.05. — 22.06.) Спачатку можа табе звалiцца на галаву многа спраў. Старайся не вырашаць важнага, бо справы могуць нечакана пайсці ў зусім не той бок. Крышку паніжэння формы (пасля ўсё будзе выдатна). 5.06. старайся сцішыцца, паправіць сабе настрой. З 9.06. пачне ўсё добра складвацца — і ў фінансах, і ў пачуццях.

(23.06. — 23.07.) Першая палова чэрвеня паплыве крыху лянiва (аж да 21.06.). Калі маеш штосьці незавершанае, не бярыся за новыя справы. Будзеш энергічны і ўпэўнены. Будуць магчымасці аформіць здаўна зацягнутыя справы.

(24.07. — 23.08.) Будзеш добра сарганізаваны, дысцыплінаваны, не прапусціш ніякай нагоды і змагацца будзеш да канца. 4-8.06. — ідэальны момант на змаганне і рызыку. Твой козыр — кемлівасць, інтэлігентнасць і баявітасць. Твае праціўнікі — бяссільныя!

(24.08. — 23.09.) Не ўседзіш на адным месцы! І будзе цябе відаць! Можаш дзейнічаць на некалькіх франтах. Паставіш на хуткасць і паспяховасць. Спрыяючыя акалічнасці, новыя шанцы і нагоды, каб здабыць тое, што хочаш. 5-6.06. — нагоды для развіцця і змагання за сваю незалежнасць. Трапяцца табе найлепшыя вырашэнні!

(24.09. — 23.10.) Будзеш хутчэй збіраць грошы, чым выдаваць. Калі хочаш кудысьці паехаць, адпачыць, выбірай месцы дзе многа сонца. Адсунь ад сябе боязь і сумненні. 8-12.06. могуць прытрапіцца непаладкі ў кантактах з супрацоўнікамі. Прычынай спрэчак будуць пустыя абяцанні і дробная мана.

(24.10. — 22.11.) Больш давярай людзям; аддадуць табе тым самым. Прытрапяцца табе новыя ідэі як павялічыць свае прыбыткі. На пачатку тыдня ніхто табе не будзе ў змозе адмовіць. 8-12.06. будзеш адораны вялікім спрытам і дыпламатыяй ды майстэрскай тактычнасцю. Ды не перанатужвайся! Свабодных Скарпіёнаў чакае землятрус у пачуццях — знойдуць ідэал; ды ці ён сапраўды ідэал?..

(23.11. — 22.12.) Замест канікул — работа, работа, работа!.. Ды будзеш рады, бо любіш гэта рабіць. Каля 6.06. даведаешся аб чымсьці, што пазітыўна адменіць тваё жыццё. Твая прысутнасць добра дзейнічае на іншых. Наладзіш новыя знаёмствы, хоць найбліжэйшы гурт сяброў застанецца той самы. І не вяжыся з клонам былога партнёра!

(23.12. — 20.01.) Будзеш весці досыць бестурботнае жыццё, ды праца дасць пра сябе знаць! Тое, з чым не справішся цяпер, надробіш у апошняй дэкадзе чэрвеня. Сонца дадасць табе ўпэўненасці, станеш нават аўтарытэтам! Можа прытрапіцца табе нагода, апраўдаць сябе на зусім новым полі дзейнасці.

(21.01. — 19.02.) Сваёй кемлівасцю здзівіш нават сам сябе! Перад табою прафесійныя і фінансавыя поспехі. Адпачынак (можа ранейшы чым заўсёды) — вельмі ўдалы, куды б ты ні падаўся. Вялікая папулярнасць. У чэрвені — найлепшы момант, каб табе заснаваць сваю фірму.

(20.02. — 21.03.) 7-11.06. — вельмі шчаслівы час, мілыя хвіліны таксама ў пары. Сонца прысвечвае і тваім хатнім справам (рамонт, перасяленне, купля дома). Аж да 16.06. праз твой дом пройдуць табуны гасцей, і ўяві сабе — паправяць табе настрой! Ды 8-12.06. можаш стаць ахвярай пустых абяцанняў, шалёнага кахання або вялікага расчаравання. Не дазволь, каб цябе хтосьці выкарыстаў!

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

ВЕЛІКОДНЫЯ астравы(з)



Асвячэнне яды ў Кутлоўцы (2005)

— У наш час ніхто ўжо не асвячае запоўненай па берагі *капанькі* яды пад Вялікдзень. Сёлета ніхто з нашых кабет не выпякаў *паскі*, — кінула мімаходзь мама.

— Як гэта?

— А каму хочацца паліць у печцы, калі ўсё пад хату даставяць...

Карацей кажучы, абрадавы пірог людзі з маёй вёскі набылі ў аб'язной краме ад дзядзькі з далёкага тут Міхалова. Сорак гадоў назад велікодны каравай, які ў Ласінскай парафіі называлі *паска*, займаў цэнтральнае месца сярод велікодных страў. Пірог выпякалі ў спецыяльнай круглай форме і прыздаблялі надпісам ХВ (з цітлай угары), ды арнаментам з разнаколернага цукровага гарошку. Гаспадыня выпякала пяць-сем пірагоў. Адзін з іх заўсёды дарылі святару, які напярэдадні Вялікадня прыязджаў у вёску асвячаць стравы. У рамках натуральнай заплаты свяшчэнніку, апрача грошай, давалі яшчэ сырыя яйкі і авёс для ягоных коней...

У наш час не адрозніць ужо праваслаўнай і каталіцкай свянцонкі. Яны ў прынцыпе аднолькавыя як па выглядзе, так і па саставе: яйка, соль, скібка хлеба або пірага, каўбаска. Яду кладуць у лазовыя кошыкі, прыздобленыя гафтаванай сурвэткай. У час ранняй літургіі ў беластоцкай Свята-Духаўскай царкве кошыкі са свянцонкай прынеслі самі цёткі і дзяўчаты. Праваслаўны мужык з крайняй асцярожнасцю ўспрымае ўсякія сімвалы. Ды і не гонар ісці яму з адной скібкай пірага ў царкву. У крыві дрэмле памяць канкрэтнай вяндліны. У час дзяцінства *паску* свяцілі ў вялікай *капаньцы* або ў *мядніцы*, пасудзіну высцілалі льняным абрусам або белай паперай і прыздаблялі аспарагусам. У цэнтры тырчэла горба лупленых яек, акручаных падвойным путам вэнджаных у альховым дыме каўбас, з кілішкам солі пасярэдзіне. Побач стаяў здобны каравай — *паска*, і ён, замест непатрэбных слоў, славіў кулінарны талент гаспадыні. У саставе абавязкова ляжалі печаныя паляндвіцы, тоўсты бачок, вараны кумпяк і пасоленае сала. Разам з кавалкам жытняга хлеба клалі груду свойскага масла і вялікую цыпу сыру. Паміж стравамі выкладалі яшчэ пафарбаваныя ў шалупінні ад цыбулі чырвоныя яйкі, якія называлі *валачобна*. Капаньку, вагой да дваццаці кілаграмаў, звычайна выносілі дзве найдужэйшыя асобы ў сям'і. Іх следам пляліся цікаўныя дзеткі з надзеяй, што бацечка пачастуе цукеркам. Да моманту прыезду святара ўсё было падрыхтавана і прыбрана. Асабліва клапаціліся пра пляцоўку, дзе асвячалі стравы. Пляц пасыпалі белым пяском, які прывозілі фурманкай з узгорка ля вёскі.

* * *

Памяць вясковых рытуалаў жывая на кожным кроку ў нашых гараджан і местачкоўцаў. Праваслаўная жанчына з Беластока ведае ўсе забабоны і пагрозы. Яна не пашле мужыка са свянцонкай у царкву. Ён жа не вернецца як чалавек дахаты, асабліва калі дзень раней спраўляў з сябрамі ў кустах абрад *яечка*. Найлепш пакінуць такога ў хаце, каб чысціў дыван.

У каталікоў няма рэжыму. Сам мужык, каб не путацца між гаршкамі, просіцца ісці ў касцёл. Выканаўшы свой святы абавязак, ён не спяшаецца дамоў, хутчэй пацягне на лавачку, каб ачуняць з калегамі ад дасвяточнай гарачкі...

Галоўнае, каб не спазніцца на гадзіну, калі асвячаюць яду...

Сёлета ў касцёле ў Мілейчычах асвячалі стравы ў дзве, тры і чатыры гадзіны пасля абеду.

У цэнтры, дзе царква, касцёл і сінагога, у парку на лавачцы прыселі аддыхнуцца два браты, якіх маці выправіла ў касцёл. Насупраць лавачкі яны прыкмецілі раскрытыя дзверы крамаў. Адтуль, выходзілі задаволеныя мужчыны з кошычкамі, упрыгожанымі карункамі.

— *Штосьці піць захацелася*, — пачаў старэйшы брат.

— *Толькі вады не купляй*, — намякнуў малодшы. — *Мяне таксама сушыць...*

Асвячэнне яды ў Беластоку (2011)

— *А што я, конь, каб ваду жлукціць!*

— *Ну то вазьмі па „жубэрку", матка не пазнае...*

Паколькі сярод местачковай моладзі не гонар спаталяць смагу адным півам, браткі яшчэ некалькі разоў збегалі ў краму. Адпачынак на лавачцы, пад карканне паркавых гракоў, задоўжыўся ў часе. Хлопцы забылі пра ўсё на свеце. І вядома, праваронілі чацвёртую гадзіну, калі апошні раз у касцёле асвячалі стравы. Зразумеўшы сваю недарэчную памылку, малодшы брат злякаўся і ўзняў лямант:

— *Што рабіць? Матка заб'е, калі даведаецца, што не асвяцілі.*

— *Не трапячыся!* — пайшоў па розум старэйшы. — *Пойдзем у царкву, там у пяць гадзін свяцяць!*

* * *

Сучасны Вялікдзень для многіх значыць адно: падарожжы. З-за апошняй моды ў першы дзень свята дарога паміж Беластокам і Заблудавам напамінала вуліцы метраполіі. Хоць набліжаўся поўдзень, у бок Бельска і Гайнаўкі цягнулі спавольненыя даўкай бясконцыя калоны машын. Нашы людзі выправіліся «паснедаць» у вёску! Я сама была вымушана разгаўляцца два разы.

У дом цешчы на паўночнай Сувальшчыне я трапіла ўжо пад вечар. Праўда, тут не частавалі абрадавымі стравамі. На стол, як заўсёды, падрыхтавалі бігас са свойскімі каўбасамі і бульбай, ды вэнджаную на літоўскі манер паляндвіцу. Абавязковай стравай тут таксама салацік з варанай гародніны, прыпраўлены маянэзам, які мужчыны празываюць *kaczy żer*.

Велікоднае снеданне пачынаюць як у нас, з варанага яйка. Яды аднак не вязуць свяціць у касцёл. Папраўдзе я перажыла шок, калі ўпершыню пабачыла як выглядае тут гэты шанаваны і ў нас рытуал. Спачатку, калі цешча ўзяла ў рукі крапіла і сама пакрапіла яе вадой, я, з разяўленым ротам, запытала:

— Так можна?

— Вада ж асвечана! — здзівілася яна.

Карацей, каб асвяціць велікоднае снеданне, хопіць раней купіць бутэльку асвечанай у касцёле вады...

(працяг будзе)

АБ'ЯВЫ

ЗАПРАШЭННЕ

Дыскусійны клуб „**АБ-БЫ**"
Пагаворым пра сучасную беларускую паэзію

Сустрэча з
Леанідам Дранько-Майсюком
і Эдуардам Акуліным
02.06.2011 18.00
Пачатковая школа № 4 у Беластоку
вул. Чэнстахоўская, 6а
Projekt realizowany dzięki dotacji Marszałka Województwa Podlaskiego

Аб'яднанне ў карысць дзяцей і моладзі якія вывучаюць беларускую мову „**АБ-БА**"
запрашае на
ўрачыстае завяршэнне навучальнага года **2010/2011**, якое пройдзе 03.06.2011 г.
у Беластоцкім асяродку культуры (кавярня „**Фама**")
па вул. Легіяновай 5 у Беластоку.
Пачатак **у 17.00**
У праграме:
1. Тэатральныя пастаноўкі ў выкананні ўдзельнікаў **гуртка „Гульня ў тэатр"**: *„Вучыся. Вучыся? Вучыся!"*, *„Цацачная крама"*.
2. Музычная праграма дзіцячай групы Студыі беларускага фальклору.
3. Развітанне з вучнямі, якія канчаюць пачатковую школу, гімназію і ліцэй.

ISSN 0546-1960